Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЧЭРВЕНЬ 15 1933 г. № 130 (4674)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Усебеларуская нарада сакратароў РК ЛКСМБ і памначпалітаў МТС і саўгасаў па камсамолу

13 і 14 чэрвеня ў ЦК ЛКСМБ адбылася ўсебеларуская нарада сакратароў РК ЛКСМБ і памначпалітаў МТС і саўгасаў па камсамолу. На нарадзе з дакладамі аб выніках веснавой сяўбы і задачах камсамолу ў прапалачна-ўборачнай кампаніі і хлебазадачы выступілі: нам. старшыні СНК і Наркамзем БССР тав. БЭНЭК і памочнік начальніка палітківраўніцтва Наркамзему т. ЭЦІН.

Па дакладах т. т. Бэнэка і Эціна былі шырока разгорнуты ажыўленыя спрэчкі. 14 чэрвеня выступалі: старшыня ЦКК КП(б)Б тав. Лычоў, начальнік палітківраўніцтва НКЗ БССР т. ПЫЖЫКАЎ, сакратар ЦК ЛКСМБ т. ГЕРЦОВІЧ, упаўнаважаны НКЗ СССР тав. АРЛОЎ і іншыя.

Учора вечарам з вялікай прамовай выступіў першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО. Нарада сустрэла тав. ГІКАЛО бурнымі, доўга незмаўкнымі аплёдысмэнтамі.

ВІЦЕБСК, ГАРАДОК, СІРОЦІНА ГАНЕБНА ЗАЦЯГВАЮЦЬ СЯЎБУ

ЖАЛЕЗНЫ, БАЛЬШАВІЦКІ АДПОР НАЙМЕНШЫМ ДЭМАБІЛІЗАЦЫЙНЫМ НАСТРОЯМ, АЛІЛЮЙШЧЫНЕ, АПАРТУНІСТЫЧНАЙ СТАЎЦЫ НА САМАЦЁК!

СЯЎБА ЯРАВЫХ ПАВІННА БЫЦЬ ЗАРАЗ-ЖА І ПОУНАСЬЦЮ ЗАВЕРШАНА!

НЕ МАРУДЗІЦЬ ДАЛЕЙ НІ АДНЭИ МІНУТЫ!

91,9 і 92,2.

Лічбы гавораць самі за сябе. **ЗАХОДНЯЯ ВОБЛАСЬЦЬ**, з якой спаборнічае БССР, **НАС АБАГНАЛА.**

Наша рэспубліка разгарнула сяўбу значна раней, чым Зах. вобласьць, прыкладна, на 10-12 дзён. Увесь час да чэрвеня мы ішлі ў авангардзе па сяўбе яравых. Зах. вобласьць адставала ў сярэднім на 30-25 проц.

Тым больш ганебнымі зьяўляюцца для нас вынікі сяўбы па рэспубліцы на 10 чэрвеня.

БССР засеяла толькі 2.461.717 гэк тараў, або 91,9 проц. пляну.

А Заходняя вобласьць — 3.134.400 га — 92,2 проц. 1 гэта ў той час, калі яшчэ ў мінулую пяцідзеўку мы мелі большыя паказальнікі.

Заходняя вобласьць упэўнена завабёўвае пярэдзінства ў спаборніцтве з нашай рэспублікай.

Возьмем такую асноўную культуру, як лён. Яшчэ ў шостай пяцідзеўцы мая мы ішлі на першым месцы па сяўбе ільну. У нашых руках былі ўсе магчымасьці значна раней, чым Зах. вобласьць, і датэрмінова выканаць плян.

А што выйшла?

Зах. вобласьць па-бальшавіцку пераламала адставаньне і першай — яшчэ 5 чэрвеня — рапартавала ЦК УсеКП(б) — тав. Сталіну і СНК СССР аб поўным выкананьні пляну па сяўбе ільну. І гэта пры заданьні ў два разы большым, чым у нас!

А мы нават і да 10 чэрвеня ня здолелі поўнасьцю засеяць лён. Усе тэрміны ганебна сарваны. Засеяна толькі 254.577 гэктараў — 97,9 проц. пляну. Такое-ж становішча і па іншых культурах, за выключэньнем збожжавых (104,2 проц. пляну).

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваёй тэлеграме адсталым раёнам з усёй сілай выкрылі прычыны нашага адставаньня ў сяўбе. Цэнтральны Камітэт і Саўнарком сваячасова зрабілі гэтым раёнам апошняе папярэджаньне і абавязалі іх поўнасьцю скончыць сяўбу максымум да 5 чэрвеня. Указаньняў, што і як трэба было рабіць, як пераматы адставаньне і поўнасьцю за апошні, вызначаны ЦК і СНК тэрмін, засеяць яравыя — адсталочыя раёны атрымалі больш, чым даволі.

Далёка, аднак, ня ўсюды, далёка ня ўсе кіраўнікі адсталочых раёнаў па-бальшавіцку ўлічылі папярэджаньне ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Наадварот, у цэлым радзе месц людзі абмежаваліся фармальным прызнаньнем памылак, бюракратычнай славесна-дэкляцыйнай адпіскай в алілюйскімі абяцаньнямі скончыць сяўбу.

Па сутнасьці ў радзе раёнаў мы маем просты сабатаж дырэктыў ЦК і СНК, колькі-б кіраўнікі гэтых раёнаў ні кляліся ў сваёй гатоўнасьці выконваць указаньні Цэнтральнага Камітэту і Саўнаркому.

Так і толькі так трэба ацэньваць работу кіраўніцтва такіх раёнаў, як **ВІЦЕБСКІ, ГАРАДОЦКІ, СІРОЦІНСКІ, БЕШАНКОВІЦКІ** і г. д.

Што зрабіла, напрыклад, віцебскае кіраўніцтва ў адказ на катэгарычную дырэктыву ЦК і СНК пакончыць з адставаньнем і поўнасьцю завяршыць сяўбу да 5 чэрвеня?

На словах, у рэзалюцыях — шмат. На справе, па сутнасьці — **НІЧОГА.** Тая-ж работа па-старынцы, панскасаноўным, славесна-дэкляцыйным мэтадамі.

Чаго варта тое, што ў Віцебску людзям, выключаным з партыі за зрыў сяўбы, па-ранейшаму даручаюць... кіраваць пасеўнай. У папярэдніх нумарох «Зьвязды» мы адзначалі ўжо, скромна кажучы, сваназабліваньне віцебскіх «выпадкаў», калі людзі, выключаныя з партыі, заставаліся... на чале парт'ячэек.

Віцебскі гарком абмежаваўся фармальнай адпіскай, дэкляцыйным прызнаньнем дапушчаных памылак. Далей рэзалюцый справа не пайшла.

Ня дзіва, што раён выканаў плян сяўбы яравых толькі на 80,9 проц. Дзіўна толькі, чаму мясцовая газэта **«ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ»** знаходзіць магчымым пры такіх ганебных паказальніках заяўляць, што ў раёне «ўжыты рашучыя захады, мабілізаваны ўсе сілы і сродкі на завяршэньне сяўбы і г. д.».

Стараньне, вартае лепшага выкарыстаньня! Відаць, крытыка памылак віцебскага кіраўніцтва і самой газэты прайшла бясьсьледна ня толькі для гаркому, але і для яго органу.

Каму патрэбна гэта шкодная алілюйшчына, гэта апартуністычнае заспакаеньне? Наколькі трэба страціць пільнасьць, каб ня бачыць сапраўднага становішча з веснавой сяўбой у раёне!

Рэзалюцыйная пільнасьць, бальшавіцкая непрымірнасьць у барацьбе за жыцьцё партыі, яе жалезную дысцыпліну і выразнае выкананьне дырэктыў нашай партыі — вось што патрабуецца ад кожнага камуніста.

Урокі веснавой сяўбы настойліва яшчэ і яшчэ раз падкрэсьліваюць неабходнасьць рашуча ўзмацніць рэзалюцыйную клясавую пільнасьць, узмацніць барацьбу з штампоўшчынай і алілюйшчынай, са славеснай дэкляцыйнасьцю, гніла-лібэральнымі адносінамі да тых, хто скажае і сабатуе дырэктывы партыі і ўраду.

Толькі пры яўным прытупленьні клясавай пільнасьці з боку мясцовага кіраўніцтва сталі магчымымі тыя буйнейшыя скажэньні, якія дапушчаны ў магілёўскім райземаддзеле.

А мясцовыя кіраўнікі і, у прыватнасьці, сакратар РК КП(б)Б тав. **КАЛОДКА** і старшыня РВК тав. **САПРЫЦКІ** ня толькі патураюць Камедаву, але і адкрыта бяруць яго пад сваю абарону.

Іменна ў гэтым, у прытупленьні клясавай пільнасьці і ў гнілым лібэралізьме да сабатажнікаў сяўбы хаваюцца асноўныя прычыны таго, што Магілёўскі раён так расьцягнуў тэрміны сяўбы.

Магілёўскія справы не паслужылі яшчэ ўрокам для некаторых партарганізацый, дзе сяўба прахопіць зусім дронна.

Чым інакш, як не абманам партыі, як не сабатажам дырэктыў ЦК і СНК трэба назваць факты з практыкі гарадоцкага кіраўніцтва (гл. «Зьвязду» ад 13 чэрвеня).

ЦК КП(б)Б зьняў з работы старшыню Гарадоцкага райвыканкому за гнілы лібэралізм, праяўлены ім у справе барацьбы з сабатажам веснавой сяўбы. Сакратару РК Эльману абвешчана вымова. ЦК абавязаў райком неадкладна па скончыць сяўбу яравых.

Якія меры прынялі гарадоцкія кіраўнікі, каб выканаць катэгарычную дырэктыву ЦК КП(б)Б? Мабілізавалі партарганізацыю на завяршэньне сяўбы? Рашуча выкрылі перарадженцаў, апартуністаў, якія патурающь кулацкаму сабатажу, замаскаваўшы свой сапраўдны твар партбілетам? Правералі ход сяўбы непасрэдна на полі — у сельсаветах, калгасах і вёсках?

Нічога падобнага! Людзі сталі на шлях простага апушчанства.

Або факт з Сіроцінскім раёнам. Гэты раён на чорнай дошцы змаль з самага пачатку сяўбы. І вось зараз, калі трэба дражыць, літаральна, кожнай мінутай, людзі толькі тое і робяць, што абмяркоўваюць на бясконцых пасяджэньнях... меры па ліквідацыі адставаньня. Не змагаюцца на палёх, у брыгадах за завяршэньне сяўбы, а сядзяць у сябе ў габінэтах і ўсё пішуць, прымаюць пастановы, а сяўба па-ранейшаму злачынна зацягваецца.

На 10 чэрвеня Сіроцінскі раён засеяў толькі 27.746 га — 67,5 проц. пляну. Самы ніжкі паказальнік за ўсёй рэспублікі!

Жалезны бальшавіцкі адпор найменшым дэмабілізацыйным настроям, стаўцы на самацёк, апартуністычнаму заспакаеньню!

Віцебскі, Сіроцінскі, Гарадоцкі і іншыя адсталочыя раёны сваімі злачынна-маруднымі тэмпамі сяўбы кладуць ганебную пляму на ўсю рэспубліку, тармозяць і зрываюць выкананьне рэспубліканскага пляну, ставяць нас з-заду Заходняй вобласьці.

Кіраўнікі гэтых раёнаў, відавочна, яшчэ і цяпер не зразумелі, што партыя не пацерпіць ніякіх адтэрміновак, што партыя будзе непрымірна выкрываць кожнага, хто на словах клянецца ў вернасьці лініі партыі, а на справе сабатуе, ня выконвае яе дырэктыў.

Адсталочыя раёны абавязаны ня толькі неадкладна і поўнасьцю да аднаго гэктара засеяць яравыя, але і па-бальшавіцку нагнаць прапушчаны час сваячасовым і высокаякасным скончэньнем праполкі і ворыва папараў і ўдарнай падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю.

Асобны рахунак да саўгасаў.

Да 10 чэрвеня саўгасы БССР засеялі толькі 177.941 гэктараў — 87,9 проц. пасеўнага заданьня. Нікуды нявартыя, зусім нецярпімыя лічбы! Асабліва трэба адзначыць ганебнейшае адставаньне сыстэмы Ўпраўнаркамсаўгасаў. Плян сяўбы яравых па саўгасах сыстэмы выкананы толькі на 68 проц. Далейшая маруднасьць—простае злачынства. Плян сяўбы яравых па саўгасах павінен быць выканан поўнасьцю і прытым неадкладна, не марудзячы далей ні адной мінуты!

Мы яшчэ можам і абавязаны за што-б там ні стала адказваць пярэдзінства, выйсьці пераможцамі ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю.

Замацаваць вынікі сяўбы ўдарным правядзеньнем прапалачна-папярэдняй кампаніі ў бальшавіцкай падрыхтоўкай да ўборкі, датэрмінова выканаць абавязацельствы на пастаўцы збожжа дзяржаве, — вось у чым цяпер асноўная асноў.

БССР

Засеяна **2.461.717** га — **91,9** проц.

Зах. вобласьць

Засеяна **3.134.400** га — **92,2** проц.

ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ПЯРШЫНСТВА

ВА ЎБОРЦЫ ЎРАДЖАЮ І ПАСТАЎЦЫ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ

ЛІСТ КАЛГАСЬНІКАЎ КАЛГАСУ „ЗАРА РЭВАЛЮЦЫІ"

Калгасьнікі-ударнікі Татарыі і Днепрапятроўшчыны абвясьцілі сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую ўборку і датэрміновую пастаўку збожжа дзяржаве.

Мы ўважліва абмеркавалі выклік калгасьнікаў Татарыі і Днепрапятроўшчыны, а таксама перадавы артыкул **«ПРАВДЫ»** «Разгорнем усесаюзнае спаборніцтва на пярэдзінства ва ўборцы і пастаўцы збожжа дзяржаве».

Ня можам, таварышы, мы стаяць у баку ад гэтай пачэснай, нашай кроўнай калгаснай справы.

Дзяржава дала нам усё — зямлю, машыны, трактары. Кожны дзень мы адчуваем, як наша ленінская партыя, наша рабоча-сялянская дзяржава клапоцяцца, дапамагаюць, дамагаюцца, каб нам жылося лепш, каб усе мы — калгасьнікі — сталі заможнымі.

НЯМА БОЛЬШ ПАЧЭСНАЙ СПРАВЫ ЯК ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЦЬ СВАЕ АБАВЯЗКІ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ

Адным словам навошта шмат гаварыць. Няма больш пачэснай задачы, як аддзякаваць дзяржаве справай, як датэрмінова і каб цалкам выканаць свае абавязацельствы па пастаўцы збожжа, добра, хутка, бяз страт убраць увесь ураджай.

Вось мы калгасьнікі с.-г. арцелі **«ЗАРА РЭВАЛЮЦЫІ»**, што на Бабруйшчыне ў Кавалескім сельсавеце, і прапануем:

— Будзем мы змагацца за пярэдзінства ва ўборцы і пастаўцы збожжа, бульбы, ільну і іншых прадуктаў нашай роднай дзяржаве, пакажам на справе, як мы выконваем свае абавязацельствы.

Дык вось, таварышы, абмяркуйце ўсё гэта ў сваіх калгасах, у брыгадах. Не марнуйце дарма залатога часу. Уборка-ж не за гарамі. Цяпер кожны дзень — год корміць.

І хіба-ж ня ганьбай зьяўляецца тое, што ў нашай рэспубліцы ёсьць яшчэ ня мала такіх гаспадарак, дзе сяўба ня скончана і на сёнешні дзень.

Куды гэта варта. Час на касьбу выходзіць, праполку скончыць, папары араць, а тут людзі яшчэ ніяк не адсеюцца.

Сорам, таварышы! Плян сяўбы трэба зараз-жа поўнасьцю выканаць, нагнаць прапушчаны час добрасумленнай работай на праполцы, ворыве папароў, касьбе і падрыхтоўцы да ўборкі.

МЫ ЎКЛЮЧАЕМСЯ ВА ЎСЕСАЮЗНАЕ СПАБОРНІЦТВА НА ЛЕПШУЮ ЎБОРКУ І ДАТЭРМІНОВУЮ ПАСТАЎКУ ЗБОЖЖА, ПЕРШЫ СНОП КАБ ДЗЯРЖАВЕ, І ВЫКЛІКАЕМ УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦІ І БССР ПАСЬЛЕДАВАЦЬ НАШАМУ ПРЫКЛАДУ.

Вядома, барацьба за поўную і датэрміновую пастаўку збожжа дзяржаве пачынаецца з сяўбы.

Мы ў сваім калгасе сяўбу правялі ня дрэнна. Гэта не хвальба. **ПЛЯН СЯЎБЫ ЯРАВЫХ ВЫКАНАН ДА 14 МАЯ.** Засеялі 103 га замест 85 па пляну МТС — 120 проц. Перавыканалі плян за лік больш каштоўных культур — бульбы на 1 гэктар, аўса — 2, ячменю — 4, пшаніцы — 2 і г. д.

Увесь пасеў зроблен добраякасна, па зяблеве. Збожжавыя засеяны па ўтоенай яшчэ летась глебе, бульба па сёлетнім гнаі. Кожная культура засеяна сваячасова на тым вучастку поля, дзе былі найлепшыя папярэднікі.

ЗЬБЯРЭМ З КОЖНАГА ГЭКТАРА ЗБОЖЖАВЫХ НЯ МЕНШ 8,5 ЦЭНТН. І БУЛЬБЫ — 125.

ХУТКА І ДОБРА, БЯЗ СТРАТ УБЯРЭМ НАШЫ КАЛГАСНЫЯ УРАДЖАІ

Мала засеяць. Можна і ў тэрмін засеяць, а калі не зьберажэм пасеваў ад пустазельля — будзем сядзець на бабах. Зараз, калі поле густа пакрылася высокімі кволымі ўсходамі, іх трэба абараніць ад палявых шкоднікаў, ад пустазельля, трэба прабаранаваць прасохшыя скобы бульбяного палетку, не забываючы ўзараць чыстыя папары.

На 10-е чэрвеня мы прапалолі пасевы пшаніцы, забаранавалі ўсе 23 га бульбы, узаралі 1 забаранавалі ўвесь папар. Да 15-га чэрвеня прапалолі ўсе прапашныя і цяпер — **НА НАШЫХ ПАЛЁХ НЕ ЗАСТАЛОСЯ НІ АДНАГО КАЛІВА, ЗАСЬМЕЧАНАГА ПУСТАЗЕЛЬЛЕМ.**

Рыхтуемся загадзя да ўборкі, правяраем кожную шрубку. Ужо адрамонтавалі жнівярку, 17 калёс, вяроўкі. Цесьляры падрыхтавалі парубкі, касілкі, граблі, а самі калгасьнікі — косы, вілы.

Сёлета, ня ў прыклад мінулага году, работа ідзе куды лепш. Самі бачым, якая глыбокая праўда ёсьць у словах тав. **СТАЛІНА**, што, каб стаць заможным, трэба працаваць сумленна, па-калгаснаму. Імя тав. Сталіна ў нас ведаюць усе — ад малога дзіцяці да сівога дзеда. Мы ганарымся, што намі кіруе ленінская партыя і такі бальшавік, такі чалавек, як таварыш Сталін. Ён і партыя вывелі нас на новы шлях, на калгасную шырокую дарогу да лепшага заможнага жыцьця.

УДАРНІКІ КАЛГАСНАЙ ПРАЦЫ УЖО СТАНОВЯЦЦА ЗАМОЖНЫМІ

Прамова тав. Сталіна на зьезьдзе калгасьнікаў дайшла проста, як кажуць, да сэрца. Інакш сталі глядзець на калгас, на калгасную справу.

Узяліся мы за гультаёў. Ім сказалі проста — цацкацца ня будзем. Адсталым калгасьнікам растлумачылі, што з людзьмі робіцца, дык і не разьбярэш адразу. Мяняюцца на вачох.

Вось у мінулым годзе наш калгасьнік **ЦЭДЗІК ІВАН** быў гультай гультаём, а цяпер? Гэты самы Цэдзік Іван стаў лепшым работнікам. Калі летась ён з усёй сям'ёй за цэлы год выпрацаваў толькі 140 працадзён, дык толькі за час сяўбы выпрацаваў 80 працадзён.

Ня мала ў нас і такіх, як **СЕВАСЬЦЯНАЎ.** Ён выконвае нормы выпрацоўкі на 120—130 проц. Калгасьнік сёньня кляшчом трымаецца за работу, ён не адлыньвае, а патрабуе работы, бо бачыць, што калі будзе добрасумленна працаваць, дык стане заможным.

Мы ўжо ўстанавілі, што сёлета атрымаем на 1 працадзень 3 кгр. збожжавых культур і 15 кгр. бульбы. Гэта значыць, што калгасьнік-ударнік Севасьцянаў, выпрацаваўшы, як летась, 400 працадзён (выпрацуе ён больш), атрымае на 4 душы сям'і 75 пудоў хлеба і 400 пудоў бульбы, апрача таго, яшчэ атрымае грошы ды корм для жывёлы.

СЕВАСЬЦЯНАЎ СТАНОВІЦЦА ЗАМОЖНЫМ КАЛГАСЬНІКАМ. А ён, Севасьцянаў, паўтараем, у нас не адзін. Мы назвалі яго для прыкладу, што сёлета атрымае наш добрасумленны калгасьнік ад калгасу.

Пралетарская дзяржава вядзе нас да заможнага жыцьця. Мы, калгасьнікі, павішы з усёй шчырасьцю выканаць свой сацыялістычны абавязак перад нашай дзяржавай. Няхай нашай падзякай за такое кіраўніцтва і ўвагу будзе датэрміновае і поўнае выкананьне загатовак.

З ПЕРШАГА-Ж СНАПА — ДЗЯРЖАВЕ

Нашаму калгасу «Зара рэвалюцыі» трэба здаць па абавязацельству 46 цэнт пэраў збожжавых культур і 253 цэнтнэраў бульбы. Урадавы тэрмін — жнівень-лістапад.

МЫ-Ж АБАВЯЗВАЕМСЯ ВЫКАНАЦЬ ПАКАЗАНЫЯ ЗАГАТОЎКІ: ПА ЗБОЖЖЫ Ў ЖНІЎНІ, А ПА БУЛЬБЕ Ў ВЕРАСЬНІ.

А падмацоўваем наша словы мы наступным:

— Уборку закончым за самы кароткі тэрмін. Ня будзем чакаць, пакуль усёпасьнее. Будзем неадкладна ўбіраць па меры пасьпяваньня, не дапускаючы ніякага перастойваньня пасеваў.

Арганізуем малацьбу непасрэдна на полі. Для гэтай мэты МТС дае трактарную малатарню. З першага абмалоту першыя-ж цэнтнэры збожжа мы адпраўляем на склад для дзяржавы.

Будзем малаціць і здаваць да таго часу, пакуль не адвезем ўсё да апошняга грама, што належыць з нашага калгасу. Да рэчы, для таго, каб абмалаціць 46 цэнтнэраў патрэбна 2, максымум 3 дні малацьбы. На падставе гэтага мы упэўнена заяўляем, што ў пачатку жніўня здамо дзяржаве ўсё, што належыць з нашага калгасу.

У жніўні-ж здамо 130 цэнтнэраў (50 проц. пляну) бульбы. Для таго, каб у нас у жніўні была бульба для здачы дзяржаве, мы пракапаліся вясною засеяць 2 га раньняга гатунку бульбы. Астатнія 123 цэнтнэры здамо ў пачатку верасьня.

Для таго, каб уборка прайшла найлепш, мы праводзім наступнае:

Да 20 чэрвеня поўнасьцю завяршаем падрыхтоўчыя работы (рамонт інвэнтару і г. д.).

Ставім на 2-тыдневы адпачынак коняй, вызначаных для работы на жніве.

Маем цьвёрдую надзею, што наш голас будзе пачут калгасьнікамі БССР і Заходняй вобласьці і яны па нашаму прыкладу ўключацца ва ўсесаюзнае спаборніцтва на лепшае правядзеньне ўборкі і датэрміновую здачу с.-г. прадуктаў дзяржаве.

Па даручэньні калгасьнікаў калгасу «Зара рэвалюцыі», Кавалеўскага сельсавету, Бабруйскага раёну, ліст падпісалі калгасьнікі-ўдарнікі:

А. Шыкевіч, Д. Цэдзік, Ф. Кірачэнкаў, І. Цедзік, Севасьцянаў

РАШУЧЫЯ ЗАХАДЫ ПА-ВІЦЕБСКУ

ВІЦЕБСК. (Ад нашых карэспандэнтаў).

Камэнтуючы становішча з сяўбой у раёне, **«ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ»** ў сваім апошнім перадавым артыкуле піша:

«... ПРЫНЯТЫ РАШУЧЫЯ ЗАХАДЫ, МАБІЛІЗАВАНЫ ЎСЕ СІЛЫ І СРОДКІ НА ЗАВЯРШЭНЬНЕ СЯЎБЫ АЎСА і г. д. і г. д.».

Так пацэньвае «Віцебскі пралетары» ў нумары ад 10 чэрвеня работу раённых арганізацый па кіраўніцтве сяўбой.

Можна падумаць, што авёс у раёне поўнасьцю засеян. Як-жа інакш, калі «прыняты рашучыя захады», «мабілізаваны ўсе сілы і сродкі» і г. д.

Нічога падобнага ў сапраўднасьці **НЯМА.** Гарком і гарсавет, як мы ўжо адзначылі ў папярэдніх нумарох «Зьвязды», **НЕ ЗАБЯСПЕЧЫЛІ** выкананьня катэгарычнай дырэктывы ЦК і СНК аб скончэньні сяўбы.

Правалішы апошні, вызначаны для раёну тэрмін — 5 чэрвеня, гарком і гарсавет не дабіліся істотных вынікаў і за наступную пяцідзеўку. Сяўба па-ранейшаму ганебна **ЗАЦЯГВАЕЦЦА.** На 10 чэрвеня плян выканан толькі ў разьмеры 80,8 проц. **АЎСА ЗАСЕЯНА ЎСЯГО 92,1 ПРОЦ.**

Якой-жа алілюйшчынай зьяўляюцца разважаньні «Віцебскага пралетара» аб «рашучых захадах»?

Якое казённае самазаспакаеньне!

Дзесятага чэрвеня стала вядомым, што раён зноў **САРВАЎ** завяршэньне сяўбы і, у прыватнасьці, сяўбы **АЎСА.**

Просты абавязак «Віцебскага пралетара» — выкрыць да канца прычыны ганебнейшага зацягваньня сяўбы, выкрыць сабатажнікаў дырэктыў ЦК і СНК.

На заўтра-ж, 11 чэрвеня, газэта абыходзіць поўным маўчаньнем той факт, што плян сяўбы аўса ня выканан.

Незразумелая, мякка кажучы, скромнасьць!

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.
А. МІКУЦКІ.

УБОРАЧНЫЯ МАШЫНЫ—У БАЯВУЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ

ЗАВОД „ЧЫРВОНЫ БАРАЦЬБІТ" ГАНЕБНА ЗРЫВАЕ ВЫПУСК ДЭТАЛЯЙ ДА ЎБОРАЧНЫХ МАШЫН

АРШАНСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ БЕЛСЕЛЬГАССНАБУ яшчэ ў 1932 г. заключыла дагавор з заводам **«Чырвоны барацьбіт»** на выраб **25 тыс.** розных дэталяй да ўборачных машын. Тэрмін выкананьня заказу—1 красавіка 1933 г. Апрача гэтага, у красавіку завод узяў абавязацельства вырабіць дадаткова 8,5 тыс. розных дэталяй. Такім чынам да 1-га чэрвеня завод павінен быў даць **31 тыс.** запасных частак да розных уборачных машын.

Аднак, па сёнешні дзень выраблена толькі **11,5 тыс.**, што складае **33 проц.** заданьня. Асабліва адстае выраб запасных частак да сенакасілак. Замест **4.500 дэталяй** зроблена толькі **687 (14 проц.).**

Такое ганебнае адставаньне тлумачыцца тым, што заводакіраўніцтва недаацэньвае ўсёй важнасьці заказу. Дырэктар заводу тав. **Лук'янаў** не правярае выкананьня заводам узятых па дагаворы абавязацельстваў, а стар'ньня заўкому і сакратар парт'ячэйкі тав. **Міртман** зусім ня ведаюць аб заказе. Былі выпадкі, калі завод з прычыны незагружанасьці работай меў прастоі, а кіраўнікі ламалі галовы над тым, дзе-б атрымаць новы заказ. Пра дагавор-жа з Белсельснабам яны зусім забыліся.

Калі прыехаў прадстаўнік Наркамзему і паставіў перад заводакіраўніцтвам, партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі пытаньне аб неабходнасьці шырокага абгаварэньня на агульных рабочых сходах аб прарыве з мэтай хутчэйшай ліквідацыі яго, тав. **Лук'янаў** і тав. **Міртман** не згадзіліся на гэта, матывуючы тым, што 7 чэрвеня заводам падпісан праверачны акт, згодна якога да 1 ліпеня выраб усіх запасных частак павінен быць скончан.

— Вось, калі да 1 ліпеня заказу ня выканаем,—гаварылі яны,—тады будзем ставіць на абгаварэньне мас, а цяпер ня трэба.

У сваіх выступленьнях ні тав. **Лук'янаў**, ні тав. **Міртман** не далі раз горнутай самакрытыкі. Яны ўвесь час імкнуліся знайсьці аб'ектыўныя прычыны, чым па сутнасьці дэмабілізавалі рабочых.

Ня меншая віна ў прарыве кладзецца і на Аршанскае аддзяленьне Белсельгасснабу, якое ня досыць рашуча ставіла пытаньне перад заводам аб зрыве ім выкананьня заказу і ў той-жа самы час зацягвала выплату грошай заводу па рахунках. Справа дайшла да таго, што паміж Белсельгасснабам і заводам узьнікла непатрэбная цеганіна. Бухгальтар заводу тав. **Пашкевіч** пісаў «прыцыпновыя» паперкі, а ў Белсельгасснабе прышывалі іх да справы, нічога не адказваючы заводу.

В. В.

НА КАСУ МАХНУЛІ РУКОЙ...

ЕЛЬСК. (Ад нашага карэспандэнта).

Перадавыя калгасы раёну — «Х-ы зьезд саветаў», «Серп і молат», «Энергія», «Праца» і г. д. — ударна праводзяць праполку.

Калгасьнікі с.-г. арцелі «Х зьезд саветаў» скончылі праполку шпаніцы. Ачышчаецца ад пустазельля апошнія гэктары ільну. Калгас «Серп і молат» адначасова з праполкай ільну разгарнуў баранаваньне бульбы. Калгасьнікі шільна сочаць, каб не засталося ні аднаго каліва, засьмечанага пустазельлем. Сьледам за баранаваньнем калгасьнікі ручнымі граблямі зграбаюць пырнік.

Ганебнейшую бястурботнасьць праяўляе райземаддзел. Калгасы ўжо даўно разгарнулі праполку, а ельскі райземаддзел толькі зараз склаў плян прапалачных работ.

Ня лепш рыхтуецца райземаддзел і да сенаўборачнай кампаніі.

Масавая сенаўборка павінна разгарнуцца з **15** чэрвеня. Раён, аднак, зусім не падрыхтаваўся да ўборачных работ. Выразных плянаў сенаўборачных работ **НЯМА.** Рамонт інвэнтару толькі пачынаецца.

Даволі ўказаць, што райземаддзел нават і на сёнешні дзень **НЯ ВЕДАЕ,** колькі ёсьць у раёне і колькі патрэбна сенаўборачных машын і інвэнтару.

Райземаддзел усё яшчэ ніяк ня можа дагаварыцца з раённай базай па снабжэньні ўборачнымі машынамі. База выпісвае нязгодныя машыны і інвэнтар. У той-жа час нават такія прылады, як косы, ручныя малаткі і бабкі, не завозяцца.

Пара, даўно пара пакончыць з такой злачынай безадказнасьцю. Няўжо-ж райвыканком ня бачыць, што ў раёне сенаўборка пад пагрозай?

СЯЎБА ЯРАВЫХ НА 10 ЧЭРВЕНЯ

ЗВОДКА НКЗ БССР

РАЁНЫ:	Засеяна	Проц.
ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА:		
Асьвейскі	13.324	85,6
Аршанскі	67.378	100,1
Бешанковіцкі	32.653	73,5
Віцебскі	30.704	80,9
Вушацкі	30.436	95,4
Гарадоцкі	43.490	70,3
Дубровенскі	28.501	80,4
Дрысенскі	34.450	96,6
Лёзьнянскі	42.856	84,5
Лепельскі	39.839	89,1
Полацкі	48.536	100,5
Расонскі	25.449	94,3
Сураскі	25.812	82,4
Сеньненскі	35.116	86,1
Сіроцінскі	27.746	67,5
Чашніцкі	25.164	96,1
Усяго па зоне:	**551.454**	**86,8**
ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА:		
Асіпавіцкі	22.793	99,4
Быхаўскі	55.884	104,5
Барысаўскі	38.372	104,2
Бялыніцкі	34.384	104,3
Бягомльскі	19.889	104,3
Бярэзінскі	35.915	100,4
Горацкі	49.921	88,1
Заслаўскі	22.913	101,0
Клімавіцкі	45.433	98,9
Крупскі	35.723	92,3
Капыльскі	43.138	101,1
Касьцюковіцкі	55.416	99,7
Клічаўскі	25.050	97,6
Дзяржынскі	33.081	95,4
Крычаўскі	22.983	102,8
Лагойскі	23.952	94,5
Магілёўскі	62.012	100,1
Мсьціслаўскі	43.151	87,8
Менскі	50.995	102,4
Прапойскі	26.690	98,6
Пухавіцкі	51.230	100,3
Смалявіцкі	32.679	101,2
Талачынскі	51.327	101,3
Чэрвеньскі	29.715	103,9
Чавускі	56.304	102,2
Чэрыкаўскі	28.827	100,5
Шклоўскі	61.152	100,7
Вузьдзенскі	22.943	99,4
Плешчаніцкі	22.339	98,2
Усяго па зоне:	**1.104.211**	**99,1**
ПАЎДНЕВАЯ ЗОНА:		
Брагінскі	20.751	104,5
Буда-Кашалёўск.	21.789	99,8
Бабруйскі	59.126	104,1
Веткаўскі	33.444	98,1
Глускі	36.276	102,0
Гомельскі	24.389	101,4
Жыткавіцкі	11.913	106,3
Кармянскі	33.097	100,9
Камарынскі	11.085	105,3
Жлобінскі	38.538	99,2
Ельскі	18.941	104,8
Лоеўскі	22.375	100,8
Любаньскі	21.897	103,2
Лельчыцкі	15.125	104,3
Мазырскі	41.867	104,2
Нараўлянскі	19.276	103,1
Парыцкі	37.014	100,9
Пятрыкоўскі	30.122	102,1
Рагачоўскі	48.850	104,7
Рэчыцкі	38.621	101,6
Слуцкі	44.433	104,4
Старобінскі	23.862	101,6
Ст.-Дароскі	22.834	105,5
Тураўскі	9.089	100,3
Церахаўскі	34.955	102,6
Чачэрскі	21.774	100,8
Ч.-Слабодзкі	19.081	104,5
Ч.-Польскі	61.944	102,3
Уваравіцкі	27.543	103,7
Хойніцкі	20.661	102,2
Усяго па зоне:	**835.872**	**102,6**
Разам па БССР:	**2.461.717**	**91,9**

НА ЗДЫМКУ: Фізкультурнікі Гомсельмашу вітаюць урачысты пленум ВСФКБ. У АВАЛЕ: член прэзыдыуму ВСФК СССР тав. МАГІТОН.

Аб фактычным скарачэньні ўстановамі штатаў і фондаў зарплаты

Пастанова Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і Калегіі НК РСІ БССР

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і Калегія НК-РСІ БССР адзначаюць:

1. Большасьць з праверэных 30 саюзных і рэспубліканскіх установ у ацьверджаныя для іх ЦКК-НК РСІ БССР штаты і фонды зарплаты ня ўкладіся.

Аднак, многія кіраўнікі ўстаноў, разглядаючы праведзенае скарачэньне, як часовую кампанію, абмежаваліся фармальным правядзеньнем устаноўленага для іх скарачэньня штатаў і фондаў зарплаты і далейшай сыстэматычнай работы па палепшэньню і патаньненьню свайго апарату не разгарнулі. Больш таго, замест далейшай барацьбы за зьніжэньне адміністрацыйных выдаткаў многія кіраўнікі ўстаноў і далей дапускаюць на штатах і зарплаце простую безгаспадарчасьць (выплата акладаў вышэ устаноўленых дзяржнармаваньнем лімітаў, скарыстаньне ўсякага роду захаваных форм зарплаты — звышчасовых, адзельных і г. д., штучнае павышэньне назвы пасад).

З 35 устаноў праверкай выяўлены парушэньні па зарплаце ў 21 установе. Найбольшая безгаспадарчасьць у гэтым напрамку выяўлена ў Дзяржсьпірце, дзе было 11 парушэньняў у зарплаце. Бел. Кіраўніцтва Сувязі — 7, Белгандлі — 7, Бел. Канторы Заготкывёла — 6, Белплодагародніне — 6 і г. д.

У Шклофарфарабыце праверкай устаноўлена 8 звышштатных адзінак, што складае 34 проц. да зацьверджанага штату.

2. Усе паказаныя факты безгаспадарчасьці маглі мець месца толькі ва ўмовах зусім невыстарчальнай барацьбы за справу палепшэньня і патаньненьня апарату з боку парт'ячэек і МК паказаных устаноў, а таксама бязьдзейнасьці сэктароў і груп праверкі выкананьня.

3. Адполькава з безгаспадарчасьцю павінны разглядацца неадпаразовыя зваротy ў НК-РСІ кіраўнікоў устаноў з патрабаваньнямі павялічыць штаты і фонды зарплаты без належнай спробы забясьпечыць тыя ці іншыя патрэбы установы ўнутры зацьверджаных штатаў і фондаў зарплаты.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)В і Калегія НК-РСІ Беларусі пастанаўляюць:

1. Зьвярнуць увагу ўсіх кіраўнікоў устаноў на неабходнасьць і далей весьці самую рашучую і настойлівую барацьбу за палепшэньне, спрашчэньне і патаньненьне свайго апарату, арганізуючы ў той-жа час сыстэматычны кантроль за захаваньнем апаратам іх устаноў зацьверджаных для іх фондаў і штатаў зарплаты.

2. Прапанаваць аддзелу снабжэньня гарсавету з 1-VII выдачу харчовых карт гак самотнага і рэспубліканскага значэньня вытвораць толькі на прадпісаныя імі вышэй з пастановы Прэзыдыуму ЦКК КП(б)В і Калегіі НК-РСІ Беларусі аб зацьверджаным штаце.

3. Прапанаваць у трохдзённы тэрмін:

а) Усім кіраўнікам устаноў і, у прыватнасьці, кіраўніку канторай Шклофарфарабыт т. Хмелю, старшыні ВКСаюз — тав. Царэнку, дырэктару Белбродтрэсту — тав. Маўчан — прывесьці свае штаты ў поўную адпаведнасьць са штатам і фондам зарплаты, зацьверджаным НК РСІ;

б) Кіраўніку канторай Дзяржбанку тав. Фэльдману і кіраўніку канторай Экспартлес тав. Расіну ўнесьці на зацьвярджэньне НК РСІ штаты незацьверджаных яшчэ органаў: па Дзяржбанку — апарат Торгоўлі, апарат ашчадкасы, штат фэльдсувязі і інш.; па экспартлесу — штат лінейнага апарату.

в) Усім кіраўнікам устаноў выплачваемым па ўстановах аклады зарплаты прывесьці ў поўную адпаведнасьць з лімітамі дзяржнармаваньня.

4. Прапанаваць усім кіраўнікам устаноў у адпаведнасьці з пастановай Прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) і Калегіі НК РСІ СССР ад 1-IV—33 г. аб адмене ва ўстановах індывідуальнага вучнёўства — скараціць існуючых вучняў в адпаведным зьніжэньнем зацьверджанага фонду зарплаты.

5. У сувязі з выяўленымі магчымасьцямі далейшага скарачэньня штату (Белрыбтрэст — на 8 адзінак, Сьніпаводтрэст — на 3 адзінкі, Упаўнаркамлес — на 4 адзінкі, Галоўдартранс — на 4 адзінкі, Белгандаль — на 2 адзінкі і г. д.), а таксама ўстанаўленьнем па радзе ўстаноў астаткаў па фондзе зарплаты і выплат акладаў, якія перавышаюць ліміты дзяржнармаваньня, скараціць прадугледжаныя гадавымі каштарысамі фонды зарплаты нижэйпаказаных устаноў:

Белгандаль	на 12.310 р.
Дзяржсьпірт	на 13.265 р.
Загатскура	на 2.830 р.
НКСувязь	на 7.938 р.
Белнапертрэст	на 9.786 р.
Упаўнаркамлес	на 15.540 р.
Белкавапсаюз	на 20.220 р.

Даручыць фінгрупе ўтварыць у частцы зарплаты пераразьлік гадавога каштарысу па ўсіх астатніх установах, скарыстаўшы матар'ялы праведзенай праверкі.

6. Прапанаваць групе Савецкага будаўніцтва НК РСІ БССР арганізаваць сыстэматычны кантроль за захаваньнем дзяржустановамі зацьверджаных для іх штатаў і фондаў зарплаты, у першую чаргу ахопліваючы праверкай неабсьледваныя яшчэ ўстановы і выяўляючы па іх магчымасьць далейшага скарачэньня штатаў і фондаў зарплаты.

7. Папярэдзіць начальнікаў сэктароў праверкі выкананьня, што яны нясуць пэрсанальную адказнасьць за арганізацыю кантролю па захаваньні ўстановамі ўстаноўленых штатаў і фондаў зарплаты.

8. Адзначаючы зусім нездавальняючую работу ячэек савецкіх устаноў у галіне мабілізацыі членаў партыі і беспартыйных на выкананьне асноўнай сваёй задачы — спрашчэньне і патаненьне дзяржапарату (пастанова ЦК ад 15-IX—26 г.), прапанаваць ячэйкам КП(б)В савецкіх устаноў разгарнуць работу па ўцягненьні членаў партыі і беспартыйных у гэту важнейшую справу, папярэдзіўшы, што работа ячэек КП(б)В будзе расцэньвацца ў залежнасьці ад пастаноўкі гэтай работы.

9. Даручыць групе Савецкага будаўніцтва сумесна з Менскай гарКК-РСІ у бліжэйшы час склікаць нараду сакратароў ячэек КП(б)В, старшынь мясцкомаў, эканомнарад, работнікаў сэктароў выкананьня, прадпрыемстваў, якія шэфствуюць над дзяржапаратам, па пытаньні спрашчэньня і патаненьня дзяржаўнага і гаспадарчага апарату.

Ход торфаздабычы

Заводы Белторфу на 12 чэрвеня

Назва заводаў	Проц. вык. дзённага заданьня.	Проц. вык. калідарнага плану.	Проц. вык. сезоннага плану.
«Закрашынскі мох»	97,3	75,4	27,9
«Свабода»	56,5	63,7	23,8
Імя Даўмана	69,2	62,0	23,0
«Чырвоная Беларусь»	63,2	59,7	17,7
«Чырвоны сьцяг»	62,4	55,1	17,4
Смалявічы	131,9	44,9	11,4
Імя першага мая	34,8	39,0	11,4
Асінторф	37,6	34,7	10,2
«Бальшавік»	62,5	26,7	9,0
Разам:	62,7	42,8	13,2

Як паказвае зводка, заводы Белторфу на 12-га чэрвеня каляндарны план торфаздабычы выканалі ўсяго на 42,8 проц. Замест 152.208 тон торфу здабыта толькі 65.263 тоны. Спачатку сэзону недадана кранне 86.945 тон.

Упарадзе за ўсіх ідзе завод «ЗАКРАШЫНСКІ МОХ», які на 12 чэрвеня каляндарны план выканаў на 75,4 проц. Але трэба адзначыць, што і ён у параўнаньні з мінулым годам працуе дрэнна. І гэта ў той час, калі ўмовы работы на заводзе сёлета значна лепшыя: рабочыя забясьпечаны жыльлём, добрым харчаваньнем і інш. Уся бяда ў тым, што праца тарфянікаў непасрэдна ў кар'ерах як сьпед не арганізавана, адсутнічае пастаяннае кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Зёрном у пачатку сэзону праваў нядрэнна работу па заключэньні паміж брыгадамі сацдагавароў, але потым пра іх забыўся і зусім не правярае, як яны выконваюцца.

Асабліва дрэнна працуюць такія рашаючыя заводы, як АСІНТОРФ і «БАЛЬШАВІК». Першы на 12 чэрвеня замест 51 тыс. тон торфу здабыў толькі 17 тыс., другі замест 27 тыс. тон — 7 тыс. На гэтых заводах амаль ні адна брыгада ня выконвае поўнасьцю дзённага заданьня. З прычыны таго, што з боку кіраўнікоў заводу не аддаецца належнай увагі «дробязям» рабочага быту, назіраецца вельмі вялікая цякучасьць рабочых. Кожны дзень пакідаюць работу дзесяткі рабочых.

Аднак, у нізкіх тэмпах торфаздабычы вінаваты ня толькі заводы і іх кіраўнікі. Белторф таксама не перабудаваў яшчэ сваёй работы ў напрамку канкрэтнай дапамогі нізавым вытворчым зьвеньням жывым кіраўніцтвам і тэхнічнай сілай. ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб выніках усебеларускай партнарады торфпрамысловасьці прапанаваў Белторфу перагледзець структуру заводакіраўніцтваў і перасунуць асноўную масу спэцыялістаў-тарфянікаў непасрэдна ў кар'ер да канца сэзону. Гэта пастанова Белторфам вы конваецца вельмі марудна. Кіраўніком Белторфу вельмі цяжка разьвітацца з канцылярска-бюракратычнымі мэтадамі кіраўніцтва вытворчасьцю.

НА ЗДЫМКУ: ударная шатурская брыгада фармовачнай машыны № 7 за работай.

Па-ударнаму правесьці праполачную

(Нарадзе па прапашна-праполачнай кампаніі і ворыве папараў, скліканай ЦКК-НК РСІ Беларусі і рэдакцыяй „Зьвязды"

З шабывалым уздымам пайшлі пад кіраўніцтвам нашай партыі шматмільённыя масы калгаснікаў і рабочых саўгасаў на весенні штурм палёў, на бой за лёзунг партыі—павысіць ураджайнасьць і ў выніку гэтага палепшыць снабжэньне рабочых, даць прамысловасьці сыроц, узмацніць і зрабіць калгасы бальшавіцкімі, а ўсіх калгаснікаў заможнымі.

Аб гэтым штурме мільёнаў красноармоўца гаворыць зводка коду весенняй сяўбы і ворыва папару ў гэтым годзе, зводка, якая пакідаюць далёка ззаду лічбы мінулых гадоў.

Многія раёны, многія МТС, саўгасы, калгасы завяршылі сёлета сяўбу ў тэрміны, якія ў два-тры разы карацей за тэрмінаў мінулага году. Да таго-ж сёлета куды вышэйшая якасьць сяўбы.

У той-жа час на некаторых участках сей-той упарта цягне ўніз карывую выкананьня плану сяўбы, у той-жа час пасобныя раёны, саўгасы, калгасы ўсё яшчэ цягнуцца ў хвасьце і неадрыўна прыліпілі да ганебнай чорнай дошкі.

У чым-жа справа?

Справа ў кіраўніцтве, справа ў тым, што ў адным выпадку работу ўзначальваюць канкрэтна, апэрацыйна, бю кіруючь бальшавікі, а ў другім—размаўнікі, на непаразуменьні захаваўшыя яшчэ партбілеты, разьвільдзяй, якія закапаліся ў груды паперы і «самазадоволена скрыпяць пер'ямі ў канцылярых».

Слуцкі, напрыклад, раён—перагарэлі сяўбы—ужо ня толькі канчае першую праполку, асабліва ільну, але Слуцкая РКК РСІ сумесна з усім раённым актывам праводзіць ужо з 1 чэрвеня масавы рэйд праверкі ходу праполачнай, ворыва папараў і падрыхтоўкі да ўборачнай. А іншыя раёны (Сіроцінскі Гарадоцкі, Бешанковіцкі, Віцебскі і інш.) яшчэ ня скончылі сяўбы.

Нарада ў ЦКК выявіла самы абураючы малюпак бюракратычнага самазаспакаеньня, абідлага кіраўніцтва, пляваньня, абідлага кіраўніцтва на данняя сапраўднага стаўленьня на мясцох.

Возьмем, напрыклад, Наркамсаўгасаў: плян і ўказаньні па прапашна-праполачнай Нісаўгасаў дзвёў да прэс праполачнай Нісаўгасаў дзвёў да прэс праполачнай толькі ў канцы мая. Трэсты тымчасам спакойна чакалі... потым пачалі распрацоўваць пляны для асобных саўгасаў. Некаторыя трэсты пляны ўжо саўгасаў. Некаторыя трэсты пляны ўжо саўгасаў. Гэтага часу не давяло плянаў да нізавых зьвеньняў — паперы не хапіла. Тракторацэнтры спусьцілі пляны толькі ў першых лічбах чэрвеня.

Пляны ідуць — трапяць у МТС, у саўгас, а там яшчэ будуць спускацца да брыгады, зьвяна і дойдуць да кожнага рабочага—калгасьніка тады, калі першая праполка і прапашка будзе ўжо закончана...

Але якая да гэтага справа наркамсаўгасаўскім і трактарацэнтрэўскім гораскіраўнікам?! Сядзяць яны сабе ў канцылярыі, самазадаволена паскрываюць пер'ямі рэгулярна распісваюцца ў атрыманьні пенсіі ...

Прапашка—праполка вельмі працаёмкія працэсы: як стаіць справа з забясьпечанасьцю саўгасаў, калгасаў, рабілай — сыстэма Наркамсаўгасаў ня ведае, таксама ня ведае, ці заключаны дагавары на нехапаючую рабсілу.

Зусім жудасны і пагражаючы малюпак у БКС: там ведаюць, што рабочай сілы патрабуецца 150 тысяч чалавекадзён, ёсьць 60 тыс., а дагаворы з рабочымі калектывамі на нехапаючую рабсілу для праполкі яшчэ не заключаны....

Праўда Белтрэсцкатрэст ведае: у яго ў 65 саўгасах працуюць ужо 2 ясьлі, 8 яшчэ адкрываюцца, а калі яны пачнуць працаваць—нікому ненядома.

Ня ведаюць пералічаньня арганізацыі, колькі ёсьць прапашна-праполачнага інвэнтару на мясцох, у якім бы станоўлі, як будзе скарыстан.

А між тым «сваячасова далі заяўкі» і пасылаюць бясконцыя «мосты» з патрабаваньнямі ў цэнт. Усё як належыць... А між тым, прадстаўнік Белсельгасснабу заявляе, што калі ў яго ня будуць узяты са складу ручныя і конныя палольнікі—ён будзе вымушан перакінуць іх у іншыя рэспублікі.

Ніякая арганізацыя не бярэ таксама заказаных трактарных акучнікаў. Трактарны парк МТС будзе, кажуць, запружны апрацоўкай папараў, а БКС, які мае 57 трактараў і ў гаспадарках якога толькі 250 та чыстых папараў, на пакладаецца аб мэханізацыі прапашна-праполачных работ.

На ўсёй нарадзе ясна выявілася антыпартыйная ўстаноўка гаспадарчых арганізацый супроць мэханізацыі сацыялістычнага земляробства, за стары царска-памешчыцкі тапны «рускі пар».

АБ ТЫХ, ЯКІЯ ЎЖО «ЎСЁ ВЕДАЮЦЬ І ЎСЁ ЎЖО ЗРАБІЛІ».

Калі мы тут не памянулі аб НК Зямляробства, у прыватнасьці аб сэктары расьлінаводзтва і арганізацыі працы, то не таму, што там усё добра, а таму, што прадстаўнікі гэтых сэктароў, на іхіх усклацдзена асабліва важная, адказная і цяжкая задача арганізаваць прапашна-праполачную і папаравую кампаніі, ў шматлікі тысяч калгасаў, якія яднаюць сотні тысяч гаспадарчых Беларусі, на пораду проста не зьявіліся, ні адзін з Наркамзямаўскіх Саўгастрэстаў.

Высьвятліць прычыны такіх недапушчальных адносін да нарады з боку шматлікіх арганізацый і арабіць адсюль належныя вывады прапануем ЦКК-РСІ БССР.

Не зьявіліся на нараду таксама прадстаўнікі ЦП саюзу рабочых МТС, ЦП саюзу зямляробных саўгасаў, мэдсанпрацы (дзіцячыя ясьлі, санітарыя, гігіена). Тут слова прадстаўляецца ЦПСБ.

Упарта не зьявіліся на нараду камсамольцы з с.-г. прэсы ЦК ЛКСМБ і рэдакцыі «Чырвоная Зьмена». Мусіць яны ўжо лічаць, што ўсё ўжо ведаюць і ўсё ўжо зрабілі?...

Адпаведныя сэктары НК Зямляробства, Наркамсаўгасаў і іх сыстэмы зьверху да нізу, не асабліваючы ні на мінуту работы на падрыхтоўцы да ўборкі, пашлі зараз-жа лабіцца крутота пералому ў сваёй працы па кіраўніцтве і арганізацыі прапашна-праполачнай і ворыва папараў.

Усе сілы, усю бальшавіцкую настойлівасьць на прапашку, праполку, ворыва папараў!

Ст.

ДАЦЬ КРАІНЕ ДОБРУЮ ДАРОГУ

Ліквідаваць бездарожжа на вёсцы — вялікая і адказная задача. Яна можа быць вырашана толькі пры ўмове масавага ўдзелу працоўных сельскіх мясцовасьцяй.

Каб забясьпечыць шырокі ўдзел на дарожных работах калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, прыцягнуць да фізычнай працы кулацка-заможныя гаспадаркі, **Наркамзем** БССР абавязан быў яшчэ да пачатку сэзону распрацаваць і спусьціць у раёны канкрэтныя мерапрыемствы па ўдзеле апошніх у дарожным будаўніцтве. Гэта важнейшая работа ня зроблена Наркамземам і да гэтага часу. Каляндарныя пляны з указаньнем процанту выкананьня работ па-квартальна ня складзены і ня спушчаны ў раёны. У райза, сельсаветах і калгасах адказныя асобы за выкананьне дарожных работ ня ўстаноўлены.

Пэрсанальная адказнасьць за ход дарожных работ па сыстэме Наркамзему ўскладзена на загадчыка арганізструктарскага сэктару тав. **Юнкура.** Але апошні амаль нічога яшчэ не зрабіў. Замест дыфэрэнцыяванага дырэктыўнага ўказаньня раёнам, 31 мая ён спусьціў у нізы ліст з заклікам раёнаў аб уключэньні ў паўтарамесячнік штурму бездарожжа, і на гэтым паставіў кропку. Што-ж канкрэтна трэба зрабіць райза, сельсавету, калгасу і працоўнаму аднаасобніку па ўдзеле ў дарожным будаўніцтве і за які тэрмін — аб гэтым ні слова. У выніку рад раёнаў, дзе закончана сяўба (Слуцкі, Барысаўскі, і інш.), не пераключыліся яшчэ на дарожныя работы.

Упаўнаркамсаўгасаў і трактарацэнтры не забясьпечылі ўдзелу ў дарожным будаўніцтве саўгасаў і МТС. Яны абмежаваліся толькі дачай дырэктыў нізом. Тэрміны адбыцьця работ не ўстаноўлены. Адказныя за гэты вучастак вылучаны толькі па МТС, па саўгасах іх няма. Удзел саўгасаў і МТС у дарожных работах прадастаўлен самацёку. Многія саўгасы і машына-трактарныя станцыі ўжо скончылі сяўбу, але колькі з іх пераключылася на дарожныя работы — ні Упаўнаркамсаўгасаў, ні трактарацэнтры ня ведаюць.

Важную ролю ў дарожным будаўніцтве павінна адыграць **дарожная сэкцыя Белкавапсаюзу.** Яна адказвае за работу гандлёвай сеткі, сталовак, за бесперабойнае снабжэньне дарожных вучасткаў прадуктамі і прамтаварамі. Посьпехамі дарсэкцыя пахваліцца ня можа. З 67 сталовак па пляну, працуе толькі 32. Астатнія не падрыхтаваны, каб распачаць работу.

Дарсэкцыя паслала для сталовак вучасткаў толькі 10 кваліфікаваных кухараў, і на гэтым супакоілася. Далейшае ўкамплектаваньне яе ня турбуе. Гэта відаць хоць-бы з таго, што дарсэкцыя і дагэтуль ня ведае, колькі і якога пэрсаналу для сталовак не хапае на ўсёй сыстэме.

Ёсьць перабоі ў снабжэньні дарожных вучасткаў і сталовак прадуктамі. Калі больш-менш здавальняюча дастаўляецца мука і крупы, дык гэтага нельга сказаць пра іншыя прадукты. Цукру і рыбы, напрыклад, вучасткі не атрымлівалі з другой палавы красавіка.

Ёсьць і выпадкі замарожваньня тавараў дарсэкцыяй. На складах сэкцыі ляжыць бавоўняная тканіны на 11.000 руб., трыкатажу на 4.000 р., суконнай вопраткі на 2.000 руб. іншага адзеньня на 15.000 руб., абутку на 4.000 руб., 426 пар галёш і 150 кілёграм мыла. Большасьць гэтых тавараў яшчэ ня спушчаны ў дарраёны.

Сэзон дарожнага будаўніцтва пачаўся. Але **ЦП саюзу шасэйных і дарожных рабочых** сустрэў яго непадрыхтаваным. Некаторыя дарожныя вучасткі (Барысаў, Клясьціны, пабудова мосту ў Полацку) не ўкамплектаваны прафработнікамі.

Для правядзеньня курсаў па падрыхтоўцы прафгрупоргаў і арганізатараў групавых вытворчых парад асьпачаваны сродкі, але яны не выкарыстоўваюцца. Курсы пачалі працаваць толькі ў Віцебску і Гомелі. Калі-ж пачнуць працаваць яны ў астатніх пунктах, культработнік ЦП тав. **Цофін** ня ведае.

Для культмасавай работы асьпачавана 61.650 руб., з іх на ліквідацыю пісьменнасьці 13.300 руб., але гэтыя грошы пакуль што ляжаць бяз руху. Арганізацыя школ пісьменных і малапісьменных не распачата.

ЦП саюзу не патурбавалася наладзіць бесперабойную работу радыёўстановак на вучастках. З агульнай колькасьці 47 установак на сёньняшні дзень працуе ня больш 10 проц.

Абвешчаны конкурс і паўтарамесячнік штурму бездарожжа абавязвае Наркамзем, Упаўнаркамсаўгасаў, трактарацэнтры, дарсэкцыі БКС, ЦП саюзу шас. і дарраборчых і ЦК ЛКСМБ перабудаваць на хаду і забясьпечыць канкрэтным і апэрацыйным кіраўніцтвам работу ў нізавых зьвеньнях.

Брыгада «Зьвязды» і ЦКК-НК РСІ **Дарашкевіч, Прахопчык, Мазурэвіч, Маскалін, Вярхоўскі, Дайнэка, Ліцьвінаў, Кандрашцеў, Есьман, Янушкевіч, Вольф, Нікіцін.**

Бушуеў

Кантраляваць рублём сельска-гаспадарчае будаўніцтва

Вытарыстаньне капіталаўкладаньняў, адпушчаных на сельска-гаспадарчае будаўніцтва, праходзіць яўна незадавальняюча.

З праведзеных у раёны для саўгасаў і МТС сродкаў у 5, 7 млн. руб., скарыстана толькі 2,8 млн. руб., або 49,7 проц., што да гадавой сумы асьпнаваных па гэту мэту капіталаўкладаньняў (18 млн. руб.) складае толькі 15,8 проц.

Шукаць прычыны невыкананьня будаўнічых пляноў на сельскай гаспадарцы ня прыходзіцца. Яны вынікаюць выключна з несвоечасовай і нявыразнай працы самых с.-г. трэстаў і трактарацэнтраў на плянаваньні будаўніцтва.

Так, тыцулыныя сьпісы асобных аб'ектаў будаўніцтва значаліся па некалькі разоў і опушчаны месцом са значным спазьненьнем. Віцебскі Малпрэстрэст дзвёў тыцулыныя сьпісы будаўніцтва да саўгасаў толькі 16 мая, Гомельскі 6 красавіка, Ільінатрактарацэнтр і красавіка, Менскі сьнінаводтрэст 2 красавіка, а астатнія трэсты ў канцы сакавіка.

Саўгасы і МТС увесь час ня ведалі, якое будаўніцтва і якія выдаткі яны павінны рабіць.

Плянаваньне аб'ектаў будаўніцтва некаторымі трэстамі і трактарацэнтрамі зьверху, без уліку сапраўдных патрэб гаспадарак, у некаторых выпадках прывяло да ўнесьненьня ў тыцулыныя сьпісы непатрэбнага будаўніцтва і нездавальняючага дзеля гаспадаркі ня ўключана (Збожжатрактарацэнтр).

Падобранасная часамі плянаваньне капітальнага будаўніцтва ў сельскай гаспадарцы прыняло на мясцох да няплянавага будаўніцтва.

Так, саўгас «Пераможа сацыялізму», Хойніцкага раёну (Гомельскі малпрэстрэст) плянаваў быў будаваць 7 аб'ектаў капітальнага будаўніцтва на суму 41,7 тыс. руб. Да будаўніцтва плянавых аб'ектаў яшчэ не прыступілена, затое бясплянавае будаўніцтва ў гэтым саўгасе ідзе поўным ходам. На пабудову заканчваньнем барацьбы з'ерыцца 1.000 руб., на будаўніцтва [illegible] дому [illegible] млыну—680 руб., кароўніка—608 руб., гаража—429 руб., канторы 227 руб.

Па саўгасу «Дукора» (Насенатрэст), Пухавіцкага раёну, на плянавае будаўніцтвы 1933 г. было асьпнавана 54.820 руб. З гэтай сумы па становішчы на 27 мая скарыстана толькі 3.631 руб., прычым у саўгасе замест фарсіраваньня плянавага будаўніцтва поўным ходам ідзе бесплянавае. Так, саўгас бясплянава пасьпеў пабудаваць ужо ў 1933 годзе пазець для інвэнтару, цыркулярку, сарай для ўпасьпіньня, прычым на гэта будаўніцтва запраўны бюджэтныя сродкі, асьпнаваныя для плянавага будаўніцтва 1933 году.

Няма неабходнасьці даказаць, што такое плянаваньне будаўніцтва ня толькі распыляе дзяржаўныя сродкі і матар'ялы, але гэтым самым зрываецца выкананьне асноўнага дзяржаўнага плану капітальнага будаўніцтва.

Такія антыдзяржаўныя ўчынкі павінны сурова каравацца. Гэтаму пазарэзьвю павінны быць падпарадкаваны і абаватыя з боку банкаў, якія фінансуюць бясплянавае будаўніцтва.

Асаблівае значэньне ў плане 1933 г. мае будаўніцтва, якое пастановамі ўрадавых органаў адносена да ліку ўдарных. Гэта будаўніцтва, адзавалося, павінна было знаходзіцца пад асобым увагай будучых арганізацый, але гэта яшчэ ня ўсюды усьвядомлена.

Прыкладам ігнараваньня ўдарнай пабудовы можа служыць саўгас «Дукора», які замест таго, каб скончыць ударна будаўніцтва пасевахавальніка, будуе жылы дом і атрыманыя сродкі па пасевахавальніку скарыстаў на ліквідацыю запазьнасьці па зарплаце мінулага году. Хойніцкая МТС лічыць нават зусім непатрэбным кончыць пабудову мацнымтрактарнай майстэрні, якая лічыцца ўдарнай пабудовай, і атрыманыя на будаўніцтва гэтай майстэрні сродкі скарыстала на купцю дому для сталоўні.

Фінансавая праграма 1933 году патрабуе рашучай барацьбы за патаненьне кошту капітальнага будаўніцтва, асабліва ў частцы выдаткаў, прыпадаючых на гужтранспарт і мясцовыя будматар'ялы.

Вопыт мінулага году паказаў, што толькі там, дзе існавала рвацтва, дзе бескантрольна рабіліся перапляты на гужу, будматар'ялах, там, дзе не сачылі за якасьцю будаўніцтва.

І у гэтым годзе саўгасы і МТС на многіх мясцох пераплацілі значныя сумы па капітальнаму рамонту трактараў, а таксама па будаўніцтву за рахунак зваротных сродкаў, стварылі для сябе напружанае фінансавае становішча, ня выплацілі зарплаты (Адамкавічі) і пры гэтым зусім ня цікавіліся пытаньнем мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў гаспадарак для перакрыцьця пераплат, чакаючы, што бюджэт перакрые гэтыя выдаткі, а між тым справа мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў саўгасаў і МТС на капітальнаўкладаньні ідзе вельмі марудна. Аб гэтым цікавяцца лічбы выкананьня плану за першы квартал 1933 году. Так, па саўгасах і МТС Менскага раёну плянова было быць сабрана 42,2 тыс. р., па Чэрвеньскім раёне 15, і тыс. руб., па Вяжынскім раёне 4,5 тыс. руб., а гэтымі раёнамі сабрана толькі 500 руб.

Бульбяны трактарацэнтр і Ільінатрактарацэнтр нават не разьмеркавалі даната ім заданьня па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў сярод МТС, бо ня ведаюць сапраўднага становішча месцаму і якое заданьне трэба даць.

Саўгасы і МТС, а разам з імі банкі не ведалі і не ведаюць ніякай барацьбы за выкананьне плану на гэтым вучастку. Многія гаспадарнікі лічаць, што з гэтым спыняцца няма чаго і разьвалюць прыкладна так: «калі ня хопіць сваіх сродкаў, то дасьць бюджэт».

Банкі і гаспадарнікі павінны безьлітасна вынрываць гэтыя шкодныя антыдзяржаўныя настроі некаторых гаспадарнікаў. Бенні, праз кантроль рублём павінны безадкладна мабілізаваць гаспадарнікаў на выяўленьне і рэалізацыю усіх унутраных рэсурсаў гаспадарні з тым, каб забясьпечыць бесперабойнае іх фінансаваньне па капітальнаму будаўніцтву.

Сыстэма Сацэмбанку, праз якую праводзіцца фінансаваньне і крэдытаваньне капіталаўкладаньняў у сельскую гаспадарку і якая з выданьнем закону саюзнага ўраду ад 27 красавіка г. г. атрымала моцную зброю для ажыцьцяўленьня сапраўднага кантролю над скарыстаньнем бюджэтных і крэдытных сродкаў, яшчэ як след не перабудавалася. Закон гэты яшчэ не прапрацаван банкамі і не ўяўлен усімі банкаўскімі работнікамі. Аб гэтым сьведчыць рад фактаў бесконтрольных выдач сродкаў (Хойнікі, Пухавічы і інш.).

Жорсткая бюджэтная дысцыпліна з боку раённых банкаў павінна навучыць гаспадарнікаў эканомна расходаваць, весьці дакладны ўлік і своячасовую справаздачнасьць. Нельга цярпець становішча, калі на 1 чэрвеня 1933 году банкі ня мелі ад саўгасаў і МТС справаздачных балянсаў за 1932 год і за 1 квартал 1933 г.

Жорсткая бюджэтна-фінансавая дысцыпліна ня можа базавацца на голым, фармальным, бюракратычным адміністраваньні з боку аддзяленьняў банку. Фінансавая дысцыпліна павінна праводзіцца шляхам вывучэньня эканомікі і фінансаў самой гаспадаркі і паасобных яе вытворчых працэсаў з тым, каб банк, пры шчыльнай увазцы з саўгасамі і МТС, на падставе дасканалага знаёмства з самой пабудовай, меў-бы магчымасьць ускрываць факты безгаспадарчасьці, падаражэньня.

Ня меншыя задачы стаяць у 1933 годзе таксама і ў галіне калгаснага будаўніцтва. Тут таксама ёсьць значнае недавыкананьне [illegible] будаўніцтва.

Бліва дрэнна стаіць справа з будаўніцтвам па сьпінаводзе, дзе з вызначаных на пляну 500 аб'ектаў пачата толькі 185.

Месцы ўсё яшчэ практыкуюць вызначэньне калгасам крэдытаў без усякага ўліку фінансавага становішча кожнага з іх паасобку і іх сапраўднай патрэбы.

Працягваецца драбленьне крэдытаў па прынцыпу ўраўніўкі, усім па крысе.

Аб гэтым сьведчаць наступныя факты: Шыловускі раёна вызначаны яму гадавы крэдыт на ўкамплектаваньне СТФ у суме 7,2 т. р. разьмеркаваў сярод 50 калгасаў па 110—170 руб. на калгас, што бязумоўна, спыняла невыкарыстаньне крэдытаў. Рагачоўскі раёна гадавы крэдыт у суме 72,5 т. руб. разьмеркаваў сярод 110 калгасаў па 127 пазуных у раёне.

Па Аршанскім раёне калгас «Парыжская Камуна» адмовіўся ад атрыманьня крэдыту на пабудову бульбахавальніка таму, што апошні ім пабудован ужо летась, і, наадварот, калгас «Прагрэс» адчуваў патрэбу ў крэдыце на скапчаньне хлеву для жывёлы, але ён яму ня быў вызначан.

Няграмотнае плянаваньне крэдыту, раздробленьне яго, позьняе давядзеньне крэдытнай да калгасаў стварыць такія ўмовы, пры якіх калгасны крэдыт не зьяўляецца зброяй для выкананьня вытворчых мерапрыемстваў, бо застанецца нявыкарыстаным, а выкарыстаны нязпачна, раздробленыя сумы не даюць належнага эфэкту.

Аддзяленьні банку да справы крэдытаваньня калгасаў падыходзяць фармальна, па-бюракратычнаму. Яны лічаць, што правільна ўстаноўць калгасам крэдыт — гэта выключна справа вага становішча калгасаў, не дапамаць у арганізацыі іх фінансавай гаспадаркі.

Крэдыты калгасам вызначаюцца без удзелу саміх калгасаў, табліцкім парадкам і амаль бяз уліку на тое запрас калгасаў. Такое мэханічнае крэдытаваньне павінна быць безадкладна зьнішчана.

Плянаваньне сельска - гаспадарчага крэдыту павінна грунтавацца на дасканалым вывучэньні фінансавага становішча кожнага калгасу і тых вытворчых затрат, якія калгас робіць для ажыцьцяўленьня плянавых мерапрыемстваў 1933 году.

Райза і банкі павінны арганізаваць скарыстаньне ў калгасах непадзельнага фондаў з тым, каб сумесна з крэдытамі зьвярнуць іх на капітальныя выдаткі.

Гэтыя задачы могуць быць выкананы толькі пры сумеснай арганізацыі райза і банкаў і пры абавязковым удзеле саміх калгасаў.

Сыстэма Сацэмбанку бяз удзелу грамадзкасьці на здолее як след арганізаваць сапраўднага кантролю ў скарыстаньні бюджэтных сродкаў і крэдытаў па прызначэньні.

Апорай для арганізацыі гэтага кантролю павінна зьяўляцца грамадзкасьць, фінансавы актыў — інстытут грамадзкіх інструктароў Сацэмбанку пры саўгасах, МТС, калгасах і сельсаветах.

Сыстэма Сацэмбанку, закліканая ажыцьцяўляць жорсткі кантроль за эфэктыўным скарыстаньнем дзяржаўных сродкаў, зможа гэту задачу ажыцьцявіць толькі тады, калі яна ўпарта будзе ажыцьцяўляць закон саюзнага ўраду ад 27-IV 1933 году, з прыстасаваньнем усіх законных мер фінансавага ўзьдзеяньня пры парушэньні гаспадарнікамі бюджэтна - плянавай дысцыпліны.

Суганасьць бюджэтна - плянавай дысцыпліны заключаецца ў тым, каб не дапускаць па-запланаванага будаўніцтва, захоўваць устаноўленыя цэны на гужтранспарт і мясцовыя будматар'ялы, на таніць кошт і паленьніць якасьць будаўніцтва, не перавышаць зацьверджаных фондаў зарплаты.

Усе гэтыя асноўныя гаспадарча-палітычныя задачы павінны быць шырока растлумачаны банкамі ўсім гаспадарнікам і ўсёй грамадзкасьці. Інакш гэта важнейшая частка — банкаўскі кантроль — заменецца ў дабрах канцылярыі і на выйдзе на шырокі шлях грамадзкага кантролю, без якога нецэлесна будзе забясьпечыць правільнае ў жыцьцё дырэктыў партыі і Ураду аб капітальным будаўніцтве на сельскай

ПА ШПАЛЬТАХ СССР

ЗЬЕЗД КА

УЗОРНА АБСЛУЖЫМ ПОЛІВА, УБОРКУ І ЗАГАТОУКІ

Адозва 2-га зьлёту сельспажыўтаварыстваў Рагачоўшчыны

да ўсіх работнікаў і каапактыву ССТ БССР

Дарагія таварышы!

Тры гі два месяцы аддзяляюць нас ад таго часу, калі мы сабраліся на ўпершыні ўдарнікаў сельспажыўтаварыстваў Рагачоўшчыны, каб абмеркаваць шляхі выхаду з таго ганебнага становішча, у якім мы тады знаходзіліся. Мы зусім ня былі падрыхтаваны да абслугоўвання веснавой сяўбы. Мы па сутнасьці стаялі ў баку ад гераічнай барацьбы калгасьнікаў краіны і якасьць сяўбы, у баку ад вялізных задач павышэньня ўраджайнасьці, ператварэньня калгасаў у буйнавытворчыя, а калгасьнікаў у заможных.

Зараз, сабраўшыся яшчэ раз для абмеркаваньня і падагульненьня вопыту работы ў часе конкурсу на абслугоўваньне пасеўнай кампаніі, мы, работнікі перадавых сельспажыўтаварыстваў з вялікім здавальненьнем адзначаем, што **ў большасьці сельспажыўтаварыстваў Рагачоўшчыны мінулы пэрыяд зьявіўся пераломным у лініі перабудовы работы вясковай сеткі каапэрацыі.**

Сельспажыўтаварыствы Рагачоўшчыны пад кіраўніцтвам райкому партыі дабіліся значных посьпехаў у абслугоўваньні сяўбы і перабудове работы ССТ, як важнейшага гандлёвага звяна па вёсцы. Каапэрацыя цесна зьвязала сваю работу з задачамі выкананьня народна-гаспадарчых пляноў, арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Нашы сельспажыўтаварыствы адыгралі не малую ролю ў перамогах, якія заваяваны Рагачоўскім раёнам на фронце сяўбы. Мы так набудавалі сваю работу, што **тавараснабжэньне і гандаль зьявіліся магутным вагаром стымуляваньня сяўбы.** Сельсаветы, калгасы, брыгады, вёскі, аднаасобнікі, якія ішлі ўпераздзе па сяўбе, атрымлівалі большую колькасьць тавараў лепшай якасьці. Зрыўгічыкам сяўбы абвяшчаўся таварны байкот.

Перадавыя сельспажыўтаварыствы, як Ціханіцкае, Прыбарокае і інш., атрымалі значна больш тавараў, чым адсталыя. Мы кожныя пяць дзён адпаведна ходу сяўбы ўстанаўлялі каэфіцыенты завозу тавараў. Развозка тавараў і гарбаты непасредна ў поле адыграла вялікую ролю ва ўзьнёсьці прадукцыйнасьці працы калгасьнікаў. Недарма калгасьнік **Казлоў** кажа: «Добра было працаваць, калі ў поле прыяжджалі развозкі ССТ і яшчэ да сьпедыцыя прывазілі гарбату».

А такіх развозак працавала па раёне 23. Работнікі развозак, каапактыў зьвязвалі продаж тавараў з праверкай якасьці сяўбы і выкананьня сацдагавораў, заключаных паміж сельспажыўтаварыствамі, калгаснымі брыгадамі і аднаасобнікамі. Па ўсім раёне было заключана 550 сацдагавораў. Гэтыя дагаворы поўнасьцю выкананы абодвымі бакамі. Мы добра зразумелі, што **асноўнай фігурай у брыгадзе зьяўляецца брыгадзір,** ад ўмеласьці работы якога залежыць вельмі многае. Таму мы аддалі вялікую ўвагу стымуляваньню работы брыгадзіра. Мы прынялі актыўны ўдзел у правядзеньні раённага конкурсу па лепшага брыгадзіра. Перадавікі-брыгадзіры атрымалі востра-дэфіцытныя тавары.

Не малую ролю адыгралі чырвоныя і чорныя дошкі, якія былі вывешаны ў крамах ССТ. У часе пасеўнай кампаніі пры крамах сельспажыўтаварыстваў выпускаліся 24 насьцен газэты. Паасобныя ССТ выпускалі газэты непасрэдна ў полі, у брыгадах.

Такая работа дапамагла нам выканаць план тавараазвароту і ўзмацніць нашу фінансавую базу. **Кварталны план тавараазвароту выкананы за два месяцы на 75 проц.**

Зразумела, што гэта толькі першыя крокі. Ёсьць яшчэ ў нас сельспажыўтаварыствы, якія не навучыліся гандляваць па-савецку, якія ня цікавяцца калгаснай вытворчасьцю. Трэба яшчэ шмат зрабіць, каб сапраўды працаваць па-новаму.

Мы зрабілі толькі малую частку вялізарнай адказнейшай працы. **Скончэньне сяўбы—гэта толькі пачатак.** Галоўнае наперадзе. Трэба па-ўдарнаму правесьці поліва, уборку і загатоўкі. Праведзеная намі гэтай вясной вялізарная работа павінна быць узнагароджана багатым ураджаем. Становішча пасеваў, за рэдкім выключэньнем, добрае.

Асноўнае цяпер—гэта забяспечыць высокі ўраджай і ўбрать яго без страт. Таму ясна, што найменшае праяўленьне дэмабілізацыйных настрояў, самазаспакаеньня вырастае ў вялікае злачынства.

У нас па Рагачоўшчыне разгарнулася работа па поліве. Разгарнулася таксама падрыхтоўка да ўборкі і здачы збожжа.

Мы ня можам стаяць у баку ад гэтай важнейшай работы. **Арганізаваць абслугоўваньне каапэрацыяй прыполачных і ўборачных работ—наш першачарговы абавязак.** Мы пораблючаемся на правядзеньне самага сур'ёзнага і адказнага этапу конкурсу—па дапамогу поліву, уборцы і збожжаздачы. Мы бярэм на сябе наступныя канкрэтныя абавязацельствы:

— Дапамагчы калгасам у арганізацыі грамадзкага харчаваньня і дзіцячых ясьлей; своячасова закупіць, забясьпечыць іх інвэнтаром і прантавамі. Для лепшага абслугоўваньня калгасьнікаў па полі арганізаваць ня менш 10 палявых ачагоў і 15 разовзак гарачых страў.

— Перабудаваць усю нашу гандлёвую практыку, сыстэматычна вывучаць попыт калгасьніка і працоўнага аднаасобніка, змагацца за добраякасны тавар, за лепшы асартымэнт, змагацца з злоўжываньнямі-гешэфтмахерамі тэндэнцыямі, з парушэньнямі савецкай палітыкі цэн.

— Шырока практыкаваць вопыт развозкі тавараў непасрэдна па поле. Для абслугоўваньня поліву і ўборкі арганізаваць ня менш 20 разовзак. Мы лічым необходным выканаць на працягу ліпеня і жніўня кварталны план тавараазвароту на менш чым на 75 проц.

— Больш тавараў і лепшай якасьці атрымаюць тыя калгасы, калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі, якія добра сумленна выканаюць свае абавязкі перад дзяржавай, па-ўдарнаму ўбяруць збожжа, ліквідуюць страты, захаваюць сацыялістычны ўраджай, поўнасьцю ва ўстаноўлены тэрмін здадуць збожжа, лён, бульбу і іншую прадукцыю.

— Зараз-жа ў часе поліва мы прыступаем да заключэньня **сацдагавораў на лепшую ахову ўраджаю і датэрміновае выкананьне загатоўчых пляноў.** Заключыць ня менш 700 сацыялістычных дагавораў і поўнасьцю іх выканаць — наша баявая задача. Мы адзначаем, што ў часе сяўбы многія дагавары аказаліся мала дзейснымі, неканкрэтнымі, іх выканьне не правяралася. Для таго, каб не паўтараць дапушчаных памылак, мы ў кожнай брыгадзе арганізуем сыгнальныя пасты з каапактыву.

— Абавязуемся ў часе загатовак пры кожным прыёмачным пункце **арганізаваць буфэты, чайныя, а пры буйнейшых пунктах — спэцыяльныя крамы.**

Чырвоныя і чорныя дошкі, выпуск насьценгазэт і інш. формы масавай работы, якія сябе поўнасьцю апраўдалі, трэба шырока скарыстаць у часе поліва, уборкі і загатовак.

Для таго, каб дасягнуць рэнтабэльнасьці работы, абавязуемся не дапускаць перавыдаткаў звыш зацьверджаных норм, поўнасьцю выканаць планы мабілізацыі сродкаў, канчаткова ліквідаваць растраты і расхрадваньне сацыялістычнай маемасьці. Кожны з нас абавязан змагацца з чужымі элементамі, якія пралезьлі ў каапэрацыйны апарат. Такія элементы трэба гнаць у шыю з каапэрацыі.

Выклікаем на сацспаборніцтва Быхаўскі райспажыўсаюз і ўсе спажыўтаварыствы БССР.

Не сумняваемся, што нашаму прыкладу пасьледуюць усе сельспажыўтаварыствы БССР і па-бажэму ўключацца ў другі этап конкурсу, у барацьбу за сапраўднае стымуляваньне высокіх тэмпаў і якасьці поліва, уборкі і здачы прадукцыі дзяржаве.

Просім газэту «Зьвязда» ўзяць на сябе абавязкі арбітра па сацспаборніцтву паміж Рагачоўскай, Быхаўскай спажывецкай каапэрацыяй і ўсімі спажывецкімі таварыствамі БССР, а газэту «Камунар» — па ўнутрараённым конкурсе.

Па даручэньні зьлёту сельспажыўтаварыстваў Рагачоўшчыны.

Ивашин Шафоны Янов-Ковінов
Дзеву Шам Тур

САМАЦЁК НЯ ЗЬНІШЧАН

«Зьвязда» пісала ўжо аб тым, што партарганізацыя дрэваапрацоўчага завода імя **Молатава** (Менск) дрэнна падрыхтавалася да чысткі партыі, ні салася аб тым, што завод да чысткі прышоў з буйным прарывам у выкананьні прамфінпляну (за першую пяцідзеўку чэрвеня выкананьне прам фінпляну было 44,47 проц.).

Гэтая лічба не патрабуе асаблівых камэнтараў, яна добра гаворыць аб тым, як партквэктыў рыхтаваўся да чысткі і з чым прышоў да яе.

На першым-жа партсходзе па чысткі 5-га чэрвеня, дзе прысутнічала значная колькасьць беспартыйных рабочых і работніц, была прынята пастанова аб абвяшчэньні дэкадніка штурму па ліквідацыі прарыву.

Штурм абвешчан. Былі размовы па цэхах, і па брыгадах, але справа далей размоў, «заверэньняў» і абяцанак не пайшла.

У цэхах па-ранейшаму непаладкі, па-ранейшаму прастойваюць варштаты (лесапільны і мэханічны цэхі), час тыя пераходкі рабочых, несваячасовая падача фабрыкатаў, адсутнасьць сацспаборніцтва ў радзе цэхаў, расхлябанасьць і прагулы.

Для падмацаваньня прыведзеных фактаў дамо некалькі лічбаў, якія выразна сьведчаць, што штурм абвешчан, а апартуністычны самацёк ня зьнішчан. **Мэблевы** цэх, дзе налічваецца 80 чалавек камуністаў, мае выкананьне пляну за 6-га чэрвеня—11,2 проц., за 7-га—29 проц., за 8-е — 26,4 проц., за 9-е—26,5 проц., за 10-е — 40,5 проц. і разам за дэкаду на 29,3 проц.

У іншых цэхах становішча ня лепшае. **Лесапільны** цэх выканаў плян па 65,7 проц., **такарны**—26,8 проц., **скрыначны**—81,8 проц., **уцільцэх** — 48,9 проц., і разам па заводзе за дэкаду—40,22 проц.

Апрача ўсяго гэтага трэба дадаць, што сходы па чысткі вельмі дрэнна наведваюцца як камуністамі і камсамольцамі, так і беспартыйнымі рабочымі і работніцамі.

Усё гэта яшчэ і яшчэ раз падкрэсьлівае, што партарганізацыя заводу імя Молатава за ліквідацыю недахопаў бярэцца нерашуча, не па-бальшавіцку.

А. Мароз.

ПАСТАНОВА РЭСПУБЛІКАНСКАЙ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б

Назначыць раённую камісію па чысткі партыі па Старобінскім раёне з наступных таварышоў:

СТАРШЫНЯ — ОБЭРФЭЛЬД — член партыі з 1917 г., сакратар партыкому ПП АДПУ.

ЧЛЕНЫ: СЕРПЕНЬ А. К. — член партыі з 1906 г., член ЦКК КП(б)Б;

КАЛІНІН — член партыі з 1918 г., старшыня Старобінскай РКК КП(б)Б.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ЛЁЗУНГІ ПЕРАТВАРЫЦЬ У КАНКРЭТНЫЯ ДЗЕЯНЬНІ

АДЗНАЧЫМ ЧЫСТКУ САПРАЎДНЫМ УЗДЫМАМ УСЁЙ НАШАЙ ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ

Аб складзе ячэйковых камісій па чыстцы партыі

Пастанова Менскай гарадзкой камісіі па чыстцы Менскай партарганізацыі ад 13 чэрвеня 1933 г.

Назначыць ячэйковыя камісіі па чыстцы Менскай партарганізацыі ў складзе наступных таварышоў:

Склад камісій.	У якіх ячэйках праводзяць чыстку.
Старшыня: ПЭДЭР А. К. — член партыі з 1917 г., член ГКК КП(б)Б, нам. нач. Галоўнага кіраўніцтва РСМ БССР **Члены: ВІГДАРОВІЧ Ф. І.** — член партыі з 1925 г., работнік ЦО «Праўды»; **КАМЕЙКА Л. С.** —член партыі з 1919 году, мацнёр заводу імя Мясьнікова.	Наркамасьветы, Белдзяржкіно, ВАН, Гістпарт, Белта, Дзяржвыдавецтва, Навукова-тэхнічнае выдавецтва, ВПІ, БДУ, НДІ камвыхаваньня, Белпедтэхнікум, музтэхнікум, індустрыяльна-педагагічны тэхнікум, фізкультурны тэхнікум, працасьветы, Яўрэйскі дзяржаўны тэатр, Беларускі дзяржаўны тэатр, радыёвяшчальне і курсы радыёвяшчаньня.
Старшыня: ВАЙНОВІЧ Х. М. — член партыі з 1919 году, кіраўнік Белканторы Загатлён. **Члены: КУДРАЕЎ В. С.** — член партыі з 1925 г., член калегіі Наркамснабу; **ГОТЛІБ Р. Д.** — член партыі з 1919 году, член ГКК КП(б)Б, культпроп абутковай фабрыкі.	Гараж Галоўдартрансу, Транспартны трэст, Аўтарэмсклад, машына-трактарная майстэрні, Галоўдартранс, аўташкола, рабфак аўтадарожнага інстытуту, аўтадарожны тэхнікум, Менкантора Саюзтрансу, гараж Саюзтрансу, Белдырэкцыя Саюзтрансу, паштовая кантора, тэлефонная кантора і сетка АТС, тэлеграф, паштова-чыгуначнае аддзяленьне, радыёвузел, Белкіраўніцтва сувязі, тэхнікум сувязі, «Чырвоны абутнік», «Чырвоны мэталіст», арцель імя Крупскай, «Дрэваапрацоўшчык», ВСКА, Белпрамхарч, Белпрамсавет, Будпрамсаюз, Белкалёспрамсаюз, Наркамсабез, камітэт узаемадапамогі.
Старшыня: ГАЎБШТЭЙН Ю. Г. — член партыі з 1919 году, работнік УПА АДПУ ВВА. **Члены: СПАЛІНСКІ Л. М.** — член партыі з 1907 г., работнік т-ва старых бальшавікоў;	МГРК, ЗІК, райспажыўсаюз, склад ГРК, Менгандаль, Белгандаль, прамаг МГРК, Плодагародтрэст, Наркамснаб, Белдзяржснаб, Загатлён, Белсельгаснаб, Плодагароднына, Белкаапсаюз, Белрыба, Загатжывёла, Загатабожжа, Саюзмаслапрам, Белсадгародтрэст, Белмалпрамтрэст.
ЛЕВІНА С. М., член партыі з 1925 году, інструктар агіт масавага аддзелу ГК КП(б)В. **Старшыня: ВЫСАКІНСКІ І. І.** — член партыі з 1918 г., упаўнаважаны транспартн. сэкцыі СССР пры транспартнай сэкцыі БССР. **Члены: БАБРОЎСКІ С. І.** — член партыі з 1917 году, работнік ЦО «Праўды»; **ЧЭЧУЛІН С. А.,** член партыі з 1919 году, нам. заг. аддзелу кадраў МенГК КП(б)В.	Белдзяржбуд, Менбуд, завод стандартных дамоў, Белбудматар'ялы, Белкамунбуд, дом Ураду, Энэргабуд, групком будаўнікоў, цагельні №№ 1, 1-3, 2-4, 5-6, 8 і 3, Белжылсаюз, Ментаржылсаюз, Будінстытут, палітэхнікум, архіт.-буд. тэхнікум, будкантора Менкамгасу.
Старшыня: ГУТАРАЎ П. Р. — член партыі з 1922 г., нам. заг. бюро скаргаў НК РСІ БССР. **Члены: ЖУК Ф. К.** — член партыі з 1919 г., ст. інспэктар Камэат СПА СССР па БССР; **АЛЬТШУЛЕР Ф. Э.** — член партыі з 1922 г., нарсудзьдзя яўрэйскай нацкамэры.	Міліцыя, школа міліцыі, 2-гі рэзэрваховы чытунгі, ВСЧ Т/О, 49 контранспарт, 27-мы контранспарт Т/О, 711-ты дарожны вучастак, пляцоўка № 53, Цэнтральны Савет Асоавіяхіму, Менгарсавет Асоавіяхіму.

Чыстка па вышэйуказаных калектывах пачынаецца з 15-га чэрвеня.

МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

ВЫКАНАЦЬ ПАСТАНОВУ ЦК

ВІЦЕБСК.

Партыйны калектыў фабрыкі «ПРАФІНТЭРН» чыстку сваіх радоў сустрэў зусім непадрыхтавана. Месячны прамфінплян у красавіку быў выкананы на 93,6 проц., а ў маі за 25 дзён дасягнута... 64,9 проц. Тэмпы работы не павышаюцца, а пасляблюцца. У асобных цэхах, як у цэхах **Астровіча і Качурына** (пашыўка штаноў) месячнае заданьне сыстэматычна выконваецца нават значна менш, чым на 64 проц. А такі самы цэх **Лінкоўскага** майскі прамфінплян выканаў толькі на 14,6 проц.

На выкананьні прамфінпляну процэнт, як відаць ужо з прыведзеных лічбаў, штомесячна паніжаецца, а бракаробства наадварот — павышаецца. Брак і пераробкі на фабрыцы ўвайшлі ў сыстэму. На апэрацыі № 57 рабочым **Лявітам** за 15 дзён да дзена 100 пераробак. На 60-ай апэрацыі рабочым **Займанам** за такі-ж час дадзена 116 пераробак. У цэхах па пашыўцы штаноў асабліва ніжат браку па кінэніх. Агульны процант браку да выпускаемай прадукцыі па фабрыцы дасягнуў 1,8 проц. Саюз швэй збыт кожны месяц адмаўляецца прымаць вырабленыя фабрыкай штаны на дзесяткі тысяч рублёў.

Усё гэта зьяўляецца вынікам адсутнасьці парт-масавай работы, вынікам адсутнасьці бальшавіцкай барацьбы за прамфінплян.

Партыйны калектыў фабрыкі не па вёў рашучай барацьбы супроць прагулаў, супроць тых людзей, якія сыстэматычна робяць брак. Нават ёсьць такія выпадкі, што асобныя камуністы, як **Малдаўскі** і іншыя ў гэтым папрамку «Б'юць рэкорд». Яны вельмі часта позьняцца на работу на адну або дзьве гадзіны.

Ні партыйны калектыў, ні цэхавыя партыйныя ячэйкі, ні прафсаюзная арганізацыя фабрыкі не змаглі арганізаваць нават такіх элемэнтарных мэтадаў масавай работы, як вывешваньне лёзунгаў, плякатаў, вітрыны браку, дошкі ўдарнікаў і г. д.

Пытаньнем аўладаньня тэхнікай партыйная арганізацыя фабрыкі «Прафінтэрн» цікавілася вельмі мала. Аб гэтым гаворыць хоць-бы такі факт: работніца цэху паліто тав. **Рагожына** ўжо больш году сядзіць на трэцім разрадзе. Рагожына па фабрыцы не адна.

Рамонт машын праходзіць яўна пездавальняюча. Машыну № 140 раман гуюць ужо другую пяцідзеўку. Машыну № 176—8 дзён, а ў сувязі з гэтым запас па яе апэрацыі ўзрос да 800 паліто.

Парткалектыў мала зьвяртаў увагі і на сваю прыгарадную гаспадарку, якая яшчэ не закончыла веснавой сяўбы. Партгрупа прыгараднай гаспадарці на чале з камуністам **Дымэнштэйнам** не арганізавала барацьбы супроць кулацкага сабатажу, супроць кулацкіх настрояў, а наадварот патурала апошнім, спасылалася на дрэннае падвор'е і г. д.

Яшчэ горш пастаўлена работа ў падшэфным **Рудакоўскім** сельсавеце, дзе плян сяўбы выканан менш чым на палову.

Па партыйных узносах ёсьць вялікая заніжанасьць. Ад 6 месяцаў да году не плацілі ўзносаў т. т. **Гошмір, Страчанка, Шнэйбэрг** і інш.

Перад чысткай КП(б)Б парткалектыў прыняў некаторыя меры. Праведзена некалькі партыйных сходаў, прысьвечаных чыстцы, арганізаваны два новыя гурткі партвучобы і інш. Але асноўнае ня зроблена. Большасьць камуністаў фабрыкі «Прафінтэрн» за час падрыхтоўкі да чысткі не навысілі сваёй авангардай ролі на вытворчасьці. Партарганізацыя фабрыкі не дабілася ліквідацыі прарыву ў выкананьні прамфінпляну.

Правёўшы напярэдадні глыбокую праверку работы партарганізацыі фабрыкі «Прафінтэрн», **ЦК КП(б)Б 7 чэрвеня вынес вельмі важную пастанову.** ЦК з усёй сур'ёзнасьцю папярэдзіў камуністаў гэтай фабрыкі: «...**Дасягнуць прарывы ў выкананьні прамфінпляну фабрыкі ЦК будзе расцэньваць выключна як няўменьне партыйнага, гаспадарчага і прафсыяльнага кіраўніцтва па-бальшавіцку працаваць».**

Інакш і нельга ставіць пытаньня. Камуністы фабрыкі «Прафінтэрн» павінны гэта ўлічыць.

М. У.

Аб зьменах у складзе раённых камісій па чыстцы па Лагойскім і Вушацкім раёнах

Пастанова рэспубліканскай камісіі па чыстцы КП(б)Б ад 9 чэрвеня 1933 г.

Унесьці наступныя зьмены ў склад раённых камісій па чыстцы партарганізацый Лагойскага і Вушацкага раёнаў:

ПА ЛАГОЙСКІМ РАЁНЕ:

Старшыней раённай камісіі замест т. **ЧЭЧЫНА** прызначыць тав. **ЛАУКМАНА Ж. Н.** — члена партыі з 1917 году па сацыяльным становішчы служачы, пам. нач. Н-скага пагранатраду.

Членам камісіі замест т. **КРУПІЦЫ** прызначыць т. **ФЭЛЬДМАНА І. Н.** — члена партыі з 1924 г., па сацыяльным становішчы рабочы; нам. дырэктара друкарні імя Сталіна.

ПА ВУШАЦКІМ РАЁНЕ:

Членам раённай камісіі замест тав. **СЬЦІПНЯК,** прызначыць тав. **БУРШТЭЙНА С. С.** — члена партыі з 1919 году, па сацыяльным становішчы — рабочы, дырэктар аптэкаабраўніцтва БССР.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

Напярэдадні чысткі

Барысаў

Бюро Барысаўскага райкому КП(б)Б вынесла сваю пастанову ў сувязі з пастановай ПК КП(б)Б аб становішчы партасьветы ў БССР. Пастанова райкому адзначае побач з дасягненьнямі ў радзе ячэек настроі самазаспакаеньня, самацёку, адрыву партасьветы ад задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Райком пастанавіў на бліжэйшым пасяджэньні бюро заслухаць даклады аб становішчы партасьветы сакратара парткалектыву заводу імя **Дамбаля**, сакратароў ячэек фабрыкі **«Прафінтэрн», МТС** і іншых. Культпропу райкому даручана з 10 чэрвеня разгарнуць сетку 2-х месячных партшкол з поўным ахопам кандыдатаў і палітычна слаба падрыхтаваных членаў партыі. Ствараюцца таксама 5-дзённыя школы для вясковых камуністаў і калгаснага актыву.

Р.

Жлобін

Назначаны на 9 чэрвеня адкрыты сход чыгуначнай партарганізацыі жлобінскага вузла, прысьвечаны чысткі членаў партыі, выстаўленых у праверачныя камісіі быў сарван. Сакратар ячэйкі ДКХ **Бамыч** і сакратар ячэйкі будаўнічага вучастку **Цыркуноў** зьявіліся на сход замест а 7 гадзіне ў 8 гадзін, сакратар ячэйкі ФЗВ **Зарнікаў** зусім не зьявіўся на сход. Старшыня мясцкому цяці не арганізаваў удзел у сходзе беспартыйных рабочых і сам зьявіўся а палове 9-тай гадзіны.

Урокі зрыву першага сходу, які зьявіўся вынікам недацэнкі палітычнага значэньня чысткі з боку партарганізацыі вузла, павінны ўлічыць уся партарганізацыя вузла і жлобінскі райком КП(б)Б

Р—а.

Годар

За паляпшэньне і патаньненьне дзяржаўнага апарату

Барацьба за паляпшэньне і патаньненьне дзяржаўнага і гаспадарчага апарату зьяўляецца першачарговай задачай камуністаў і беспартыйнай масы наогул, рабочых і служачых, працуючых у саўгасах, гаспрадпрыемствах, каапэрацыйных арганізацыях.

Між тым ня ўсюды барацьба за патаньненьне і паляпшэньне савецкага апарату пастаўлена на належную вышыню. Напрыклад, начальнік адміністрацыйна - гаспадарчых сэктароў часта дублююць работу загатчыкаў гаспадарак; адказныя выканаўцы па калгасным гандлі дублююць работу адказных выканаўцаў па гандлёвай сетцы (Аб'яднаньне жывёлагадоўчых фэрм і інш.).

Дырэктыва партыі і ўраду аб скарачэньні штатаў і фондаў зарплаты была накіравана на тое, каб гаспадарнікі ўпучынулую падшыні да пытаньня паляпшэньня і патаньненьня свайго апарату.

Дагэтуль рэд кіруючых работнікаў яшчэ не разьвіў пачуцьця рэжыму эканоміі ў дзелаўпадабнае штатаў. Многія кіраўнікі ўстаноў расцэньваюць праведзенае скарачэньне штатаў, як часовую кампанію, абмежаваліся фармальнымі правядзеньнем устаноўленага для іх скарачэньня штатаў і фондаў зарплаты і далейшай работы па паляпшэньні і патаньненьні свайго апарату не разгарнулі.

Дзяржапарат часта ня выконвае задач, якія пастаўлены перад ім, і не пастаянна за хозам сацыялістычнага будаўніцтва (Талачынскі суд).

XVI партканфэрэнцыя наступным чынам фармулявала задачы па перабудове работы дзяржапарату:

«Галоўнымі задачамі, што высунуты пяцігадовым планам народнай гаспадаркі ... па могуць быць выраблены без сапраўднага паляпшэньня дзяржаўнага апарату, без яго спрашчэньня і патаньненьня, без выразнага вырашэньня кожным звяном дзяржаўнага апарату задач, якія пастаўлены перад ім без разшчэпленьня перамаганьня яго коснасьці, валакіты бюракратычнага зацікі, кампанейскай кругавой парукі і пацяжэлівасьці да патрэб працоўных, без самага рашучага выкананьня з апарату чыноўнікаў, якія вырашаюцца з капіталістычнымі і кулацкімі элементамі, або пакінуты давать адпор ініцыятывам кулацка-капіталістычнага наступу на пралетарыят і скрыўляючых класавую лінію, без ліквідацыі форм кіраўніцтва, якія ажыўшых і несадавальняюць Савецкую краіну».

Гэтыя задачы былі пастаўлены перад дзяржапаратам у той час, калі партыя стаяла перад вырашэньнем задач першай пяцігодкі. Давялося правесьці вялізарнейшую работу па спрашчэньні, скарачэньні і патаньненьні дзяржаўнага апарату, па ўдасканаленьні яго работы, па набліжэньні апарату да тых задач, якія былі высунуты першай пяцігодкай.

Другая пяцігодка ўключае ў сябе задачу яшчэ большага ўдасканаленьня апарату дзяржаўнай улады, бо адміраньне дзяржавы можа пайсьці праз этап узмацненьня магутнасьці дзяржавы дыктатуры пралетарыяту і яго апарату. Вышэйшае разьвіцьцё дзяржаўнай улады ў мэтах падрыхтоўкі ўмоў для адміраньня дзяржаўнай улады—вось марксіцкая фармула. Гэта «суперэчліва»? Так, «суперэчліва». Але суперэчлівасьць гэта жыцьцёва і яна цалкам зілюстроўвае марксаву дыялектыку» (Сталін XVI партзьезд).

Перад намі зараз стаіць задача: яшчэ больш узмацніць работу дзяржапарату адпаведна з сыстэмай народнай гаспадаркі і трэба з усёй [illegible] і сакратар юрыс-консульт.

вінцкай рашучасьцю ўдарыць па тых, хто пагардліва адносіцца да выкананьня гэтай задачы.

Праведзеная ЦКК-РСІ праверка 30 саюзных і рэспубліканскіх устаноў БССР паказала, што ў нашых установах яшчэ ёсьць вялікарныя магчымасьці па скарачэньні адміністрацыйных выдаткаў. Праверка паказала, што кіраўнікі ўстаноў, замест барацьбы за далейшае скарачэньне апарату дапушчаюць па штатах і зарплаце простую бесгаспадарчасьць (выплата аклада звыш устаноўленых дзяржнармаваньнем ліквідаў, скарыстаньне розных заказных форм звышчасовых, вызольных, штучнае павышэньне пазваў пасад).

Усе гэтыя зьявішчы часта не сустракаюць адпаведнага адпору з боку камуністаў, якія працуюць у савецкіх, гаспадарчых, каапэрацыйных арганізацыях. Дырэктыва партыі аб тым, што «савецкія ячэйкі павінны стаць актыўным дапаможнікам кіраўніцкіх устаноў, партыйных органаў (у прыватнасьці КК-РСІ) у справе паляпшэньня арганізацыі работы сваёй установы, зьвяшчэньня бюракратызму, правядзеньня суровай экономіі ў выдаткаваньні дзяржаўных сродкаў, спрашчэньні і патаньненьні апарату» (рэзалюцыя ЦК УсеКП(б) — 15-IX—1926 г.) яшчэ да гэтага часу не знайшла сапраўды бальшавіцкага праламленьня ў рабоце ячэек дзяржаўных устаноў.

З 30 устаноў, ахопленых праверкай, у 21 былі выяўлены парушэньні па зарплаце.

Бесгаспадарчасьць выкрыта ў Белдзяржкіно — 11 парушэньняў, Белканторы сталі — 7, Белтаўсы — 7, Белканторы Загатжывёла — 6 і г. д.

У пяцігадовым правяркай установлена 8 зьвышштатных адзінак, што складае 34 проц. да зацьверджанага штату.

Праверка выявіла, што ў Саюзлёгбыцце ёсьць ліцэнзія работніці: таваравед, адказны выканаўца па ўліку і інш., усяго 5 чалавек.

На абслугоўваньні жывёлагадоўчых фэрм ліцэнзіі зьяўляюцца: сакратар праўленьня, адказны выканаўца па [illegible] і сакратар юрыс-консульт.

У гэтай-жа установе галоўбух скарыстоўваецца не па прызначэньні. На працягу 45 дзён «знаходзіцца на Каўказе ў камандзіроўцы па загатоўках»... (??). Гэта ў той час, калі ў апараце справаздачнасьць пастаўлена дрэнна.

Гэтыя факты ні ад партыйнай ячэйкі, ні іншых арганізацый аб'яднаньня не атрымалі належнай ацэнкі.

Парушэньні ў штатных расьпісаньнях і пасадавых акладах выяўлены ў Белдзяржкіно — па штаце зацьверджана інжынер-механік, у налічэньні ёсьць тэхнік-канструктар, замест інструктара-бухгальтара — нам. бухгальтара.

Рад пасад аплачваецца вышэй устаноўленых ставак дзяржзарабаўнаньня. Заг. пляцава-вытворчым сэктарам замест 450 атрымлівае 550 руб. Адказны выканаўца замест 200 — 250 р., інспэктар замест 175 — 225 руб.

Адным з відаў захаванай заработнай платы выяўляецца ва многіх установах утрыманьне вучнёўства (Упаўнаркамсувязі, БКС). Гэта тады, калі мы маем рад пастаноў, якія катэгарычна забараняюць утрыманьне вучнёўства, вучняў (броць). Пры чым гэтыя вучні скарыстоўваюцца на адпаведных вучэбных работ у якасьці асноўных работнікаў і замяшчаюцца людзьмі, даўно вызначанымі з вучнёўскага ўзросту (апарат Упаўнаркамсувязі).

Есьць выпадкі незаконнага выплачваньня іншых сродкаў заработнай платы: Аб'яднаньнем жывёлагадоўчых фэрм выплачана за складаньне балянсу 2.153 руб., за кошт утрыманьня магазынаў. Трэба адзначыць, што гэта зьявішча характэрна і для іншых устаноў.

Пастанова ўрадавых органаў аб скарыстаньні лішніх работнікаў з цэнтральных устаноў на пэрыферыі, для ўмацненьня раённага апарату ня выкананa.

Гэта ілюструюць наступныя лічбы: усяго па 18 установах было скарочана 326 чал., а накіравана на работу ў раёны толькі 11 чал. Гэта гаворыць за тое, што кіраўнікі ўстаноў абмежаваліся накіраваньнем у НК Працы толькі сьпісаў скарочаных і на гэтым супакоіліся.

Белкаапсаюз з 33 скарочаных накіраваў у Наркампрацы сыпіс усяго на 13 чал., астатнія засталіся там-жа, або ў іншых установах Менску. Наркамзямлі з 41 работніка на раён паслаў толькі 1. НКФ — скарочана 19, з іх накіравана ў раён — 5, ашчадкаса і дзяржбанк — 2, астатнія невядома дзе. Наркампрацы са скарочаных 13 чалавек накіраваў у раён толькі адзнаго, аб астатніх вестак зусім няма.

Наркампрацы не змагаўся за выкананьне дырэктыў ураду, асабліва за накіраваньне ў раён рахункова работнікаў, у якіх рабы маюць вострую патрэбу. Па радзе ўстаноў (Белплодагародніна, Торгсін, Экспартлес, Дзяржбанк і інш.) рахунковых працаўнікі аселі ў Менску.

У работу патаньненьня дзяржаўнага і гаспадарчага апарату ня ўцягнуты прафсаюзныя арганізацыі.

Тав. **Сталін** на XVI партзьездзе гаварыў, што «**небасьпека бюракратызму заключаецца ў тым, што ён ня церпіць праверкі выкананьня і імкнецца ператварыць асноўныя ўказаньні кіруючых арганізацый у пустую перапіску, адарваную ад жыцьця**».

Абсалютаньне скарачэньня штатаў і фондаў зарплаты паказала, што кіруючыя сэктары гаспадарнікі ў пустую перапіску, адарваную ад жыцьця.

Абсалютаньне скарачэньня штатаў і фондаў зарплаты паказала, што кіруючыя сэктары гаспадарнікі ў пустую перапіску, адарваную ад жыцьця.

Пашэ задача — так набудаваць зараз і яго работу, каб канкрэтнае кіраўніцтва і праверка выкананьня былі б у ньняты на новую, яшчэ больш высокую ступень. У правяркасьці праверка выкананьня дырэктыў партыі ў галіне паляпшэньня работы апарату, яго скарачэньня і патаньненьня павінна заняць значнае месца ў рабоце сэктароў кантролю выкананьня.

Пры ўмелай арганізацыі мас вакол работы дзяржапарату, пры самым шырокім іх уцягненьні ў непасрэдную справу выкананьня функцый кіраўніцтва, апэрацыйнай дзейнасьці можна цалкам выканаць тыя задачы, якія стаяць перад дзяржапаратам сацыялістычнае будаўніцтва.

КАНФЭРЭНЦЫЯ БЕСПРАСЬВЕТНАГА ПЭСЫМІЗМУ

66 рэцэптаў лячэньня хранічна хворага капіталізму

ЛЁНДАН, 12. (БЕЛТА). Адкрываючы сёньня пасяджэньне экапамічнай канфэрэнцыі, **Макданальд** паведаміў, што згодна пастановы бюро для агульных выступленьняў адводзіцца тры дні. Макданальд прапанаваў абмежаваць час аратару 15 мінутамі, робячы некаторыя выключэньні толькі для асабліва значных выступленьняў. Агаласіўшы прывітальную тэлеграму жэнэўскай «канфэрэнцыі міжнароднага бюро працы пры Лізе нацый», Мак Данальд даў слова французскаму прэм'ер-міністру Далад'е.

Далад'е ў сваёй прамове напомніў аб 30-мільённым сусьветным беспрацоўі і ўказаў, што ўсяго памяшканьня, дзе адбываецца канфэрэнцыя, не хапіла-б, каб зьмясьціць усе трактаты аб крызісе.

«Мы павінны, — заявіў Далад'е,— вырашыць праблемы грошай, прадукцыі і тавараабмену. Французская праграма зводзіцца да неабходнасьці стабілізацыі валют, заключэньня працяжных, гандлёвых дагавораў, згод аб рацыяналізацыі вытворчасьці, арганізацыі грамадзкіх работ буйнага маштабу для прадастаўленьня работы беспрацоўным».

Італьянскі міністар фінансаў падкрэсьліў, што для стабілізацыі валют, павышэньня ўзроўню цэн і скасаваньня гандлёвых бар'ераў неабходна папярэдняе скасаваньне таго бар'еру, які стварае для сусьветнай гаспадаркі міжнародныя даўгі. Італьянскі дэлегат закончыў прамову заклікам да «супрацоўніцтва».

Прадстаўнік аднаго з брытанскіх даміньёнаў — Паўднёва-афрыканскага саюзу — генэрал Смэтс рэзка выступіў супроць ПАЗШ.

Японскі дэлегат Ішыі сказаў, што Японія гатова да супрацоўніцтва, бо правал канфэрэнцыі азначаў-бы сусьветнае экапамічнае крушэньне.

Германскі міністар замежных спраў **Нэйрат** выступіў з безьзмястоўнай прамовай. Пасьля выступленьня дэлегатаў **Польшчы, Кубы і Балгарыі** пасяджэньне закрылася і пачалося закрытае пасяджэньне.

Канфэрэнцыі прадстаіць выслухаць 66 дэкларацый розных дэлегацый наконт мэтадаў барацьбы з крызісам і яго вынікамі. Уся канфэрэнцыя з нецярпеньнем чакае савецкага выступленьня. З гэтага поваду ідуць усялякія чуткі і здагадкі.

* * *

Асноўнай прычынай беспрасьветнага пэсымізму, пануючага на канфэрэнцыі, зьяўляецца той просты факт, што на гэты раз невядома, за чый кошт можна будзе прабаваць «выратоўваць» заняпадаючы капіталізм. 11 год таму назад ініцыятары Генуэзкай канфэрэнцыі нэйўна верылі, што гэта будзе зроблена за кошт Савецкага Саюзу, зараз на першым годзе другой пяцігодкі толькі цьвёрдаполыя могуць песьціць гэтую мару. 6 год таму назад на экапамічнай канфэрэнцыі ў Жэнэве яшчэ тлела надзея, што капіталістычны сьвет будзе выратован за кошт Германіі. Цяпер і гэта надзея адпала, бо дзе нічога няма, там і ўзяць няма чаго. Другая прычына пэсымізму гэта — адсутнасьць аўтарытэтнага «гаспадара», якім у Вэрсалі былі ПАЗШ, у Генуі і часткова ў Жэнэве — Англія. Таму апрача афіцыяльных, чыста дэкарацыйных выступленьняў на канфэрэнцыі галоўная работа дэлегацый будзе працякаць за кулісамі, дзе будуць скалачвацца групоўкі, дзе будуць адбывацца піхаманкавыя пошукі шляхоў, калі не перамаганьня, дык хоць-бы замаруджваньня тэмпаў развалу капіталізму.

Англа-амэрыканская фінансавая схватка

Курс даляра зноў зьнізіўся

ЛЁНДАН, 13. (ТАСС). Упамінаньне аб ваенных даўгох у прамове Макданальда на экапамічнай канфэрэнцыі выклікала прыметнае раздражэньне дэлегацыі ПАЗШ. Паведамляюць, што **Рузвэльт адхіліў прапанову Англіі зрабіць у кошт чэрвеньскага плацяжу невялікі ўзнос** «у знак добрай волі». Ангельскі друк прадракае фінансавы крах, калі ня будзе выражана пытаньне аб даўгох.

У часе пасяджэньня канфэрэнцыі курс даляра зноў зьнізіўся. Фунт катываўся ў 4,20 даляра. Брытанскія колы ня ўтойваюць свайго раздражэньня. Друк адкрыта заяўляе, што амэрыканскія ўлады праводзяць біржавыя махінацыі з мэтай абясцэніць даляр і ўзмацніць пазыцыі амэрыканскай дэлегацыі пры нератаворах аб стабілізацыі валют. Сапраўды, амэрыканскія дэлегаты прапанавалі стабілізаваць курс даляра і фунта на апошнім узроўні 4,20 даляра за фунт. Гэта прапанова была катэгарычна адхілена брытанскімі экспэртамі, якія прапануюць 4 даляры за фунт. Брытанскія экспэрты, апрача таго, прапанавалі стварыць міжнародны залаты запас для стабілізацыі валют. Амэрыканцы адхілілі гэту прапанову, відавочна, жадаючы мець поўную свабоду ў абесцэненьні даляра. Брытанскі друк пагражае контр-мерамі.

„Лёнданская канфэрэнцыя ня выратуе сьвет ад вайны"

Н'Ю-ЕРК, 13. (БЕЛТА). Прэса Скрыпс-Говарда прадракае поўны развал лёнданскай экапамічнай канфэрэнцыі. Газэты пішуць: «Міжнароднае палітычнае становішча больш напружана, чым калі-небудзь з часу сусьветнай вайны. У Германіі ўстанавіўся шалёны рэжым Гітлера. Японія імкнецца да заваёў. Урады прыкладаюць усе большыя намаганьні, каб быць гатовымі да вайны. **Магчымасьць сапраўднага раззбраеньня меншая, чым калі небудзь за апошнія дзесяць год».**

„Бязладзьдзе на КУЧ--сродак да паніжэньня яе вартасьці"

Ангельскі друк аб становішчы на Усходняй лініі КУЧ

ЛЁНДАН, 13. (БЕЛТА). Харбінскі карэспандэнт «МАНЧЭСТЭР ГАРДЫЯН», каментуючы бандыцкія напёты на КУЧ, піша: «У выніку гэтых напётаў на КУЧ значна скарочаецца грузавы рух. Усходняя лінія дарогі церпіць таксама вялікія матар'яльныя страты. Бандыты не даюць працаваць чыгуначнаму персаналу, забіваюць і ўводзяць работнікаў.

«Ня робіцца ніякіх спроб, — гаворыць карэспандэнт, — падтрымаць парадак на Усходняй лініі таму што, як думаюць некаторыя, чым больш бязладзьдзя на гэтай лініі, тым больш шансаў купіць танна дарогу ў Савецкай Расіі».

Пахаваньне Сяргея Іванавіча Гусева

Учора (13 чэрвеня) у Маскву прыбыло цела памёршага ў Крыме старэйшага бальшавіка, загартаванага змагара за сацыялізм, СЯРГЕЯ ІВАНАВІЧА ГУСЕВА. Севастопальскі цягнік з целам памёршага спатыкалі т. т. Стэцкі, Яраслаўскі, Пятніцкі, Стасава, Катаяма, Кусінен, Бэла Кун, Коларaў, Лазоўскі, Кнорын, Сьмідовіч, Ленгнік, Шотман, Малышаў, Коган, Кулькоў, Гопнэр і інш.

З Курскага вакзалу труна з целам нябожчыка была перавезена на аўтамобілі з чырвонымі жалобнымі сьцягамі ў крэматоры.

У 11 гадз. раніцы урна з прахам С. І. ГУСЕВА была перавезена ў будынак ЦВК на Красным пляцы і ўстаноўлена ў залі ЦВК.

СПАЧУВАНЬНЕ АНГЕЛЬСКАЙ КАМПАРТЫІ

МАСКВА, 14. (ТАСС). ВККІ атрымана з ЛЁНДАНУ ад ГАРЫ ПОЛІТА наступная тэлеграма: «Выказваю ад імя ангельскай кампартыі спачуваньне з поваду сьмерці тав. ГУСЕВА. Сьмерць ад важнага рэвалюцыйнага байца і стойкага бальшавіка — вялікая страта для III-га Інтэрнацыяналу».

Далейшыя правакацыі аўстрыйскіх нацыянал-сацыялістаў

Жорсткія рэпрэсыі ўраду Дольфуса

ВЕНА, 13. (БЕЛТА). Становішча ў Аўстрыі застаецца надзвычай напружаным. Зноў кінуты бомбы ў радзе месц, у прыватнасьці, у магазын уніцыфіцыраных цэн. Як відома, натрабаваньне аб закрыцьці такіх магазынаў зьяўляецца адным з пунктаў праграмы нацыянал-сацыялістаў. Арыштован прадстаўнік германскіх нацыянал-сацыялістаў у Аўстрыі **Габіхт.** Кіраўнік аўстрыйскай нац.-сацыялістскай партыі **Прокш** уцёк за-граніцу.

Учора, каля б. імпэратарскага палацу **Шэнбрунэ,** зноў знойдзена бомба. Згодна паведамленьню газэт хэймвэру, са сьледчага матар'ялу па справе арыштаваных нацыянал-сацыялістаў відаць, што **нацыянал-сацыялісты падрыхтоўвалі путч,** маючы намер выклікаць паніку сярод насельніцтва і прымусіць хрысьціянска-сацыяльную партыю згадзіцца на ўрадавую кааліцыю з нацыянал-сацыялістамі.

«Ахт ур блят» сьцьвярджае, што нацыянал-сацыялістскі путч падрыхтоўваўся непасрадна начальнікам штабу нацыянал - сацыялістскай партыі **Рэмам.** Венская паліцыя і жандармэрыя прыведзены ў баявую гатоўнасьць. На ўсіх вуліцах **Вены** каля грамадзкіх будынкаў і кафэ выстаўлены ўзмоцненыя паліцэйскія патрулі. Савет міністраў пастанавіў забараніць дзяржаўным служачым прымаць удзел у нацыянал-сацыялістскім руху. У **Вене і ў правінцыях** прызначаны спэцыяльныя камісары па забесьпячэньні супакою.

Рэзкі пратэст германскага ўраду

БЭРЛІН, 14. (БЕЛТА). Германскае пасольства **ў Вене** перадала Аўстрыйскаму ўраду рэзкі пратэст супроць арышту загадчыка Бюро друку германскага пасольства ў Аўстрыі **Габіхта.** У заяве германскага пасольства ўказваецца, што яно пакідае за сабою свабоду прадпрыняць далейшыя крокі.

Катаржныя прысуды па справе данцыгскіх камуністаў

ВАРШАВА, 13. (ТАСС). Данцыгскі суд вынес прыгавор па справе 21 камуніста, якія абвінавачваюцца ў раскрадваньні зброі.

Падсудныя—камдэпутат **Плянікоўскі і Блезэрн** апраўданы. Падсудны **Тахлінскі** прыгавораны да **3 год 5 месяцаў,** а **Флакоўскі** — да **3 год катаргі.** Двое падсудных прыгавораны да **паўтара год турмы кожны.** Рэшта — да розных тэрмінаў **ад аднаго месяца да аднаго году.** На працэсе ўстаноўлена, што рэвальвэр, знойдзены пры вобыску ў Плянікоўскага, быў падкінут правакатарам. Усе падсудныя заявілі і гэта пацьвердзілася паказаньнем паліцэйскага, што **ў часе допыту паліцэйскія зьбівалі іх, імкнучыся вымусіць у іх прызнаньне,** быццам-бы зброя была пакрадзена па загаду данцыгскай арганізацыі кайпартыі.

АПОШНІЯ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Сялянскія хваляваньні ў Кракаўскім ваяводзтве

ВАРШАВА, 14. (БЕЛТА). У ВАРШАВЕ цыркулююць чуткі аб сялянскіх хваляваньнях у некаторых паветах КРАКАЎСКАГА ваяводзтва, выкліканых цяжкім становішчам сялянства. Гэтыя чуткі пацьвярджае газэта «РОБОТНІК», якая паведамляе, што ў РОПЧЫЦАХ (павятовы горад Кракаўскага ваяводзтва) АДБЫЛІСЯ МАСАВЫЯ ВЫСТУПЛЕНЬНІ супроць некаторых асоб, якія належаць да «ўрадавага лягеру».

Вільня—горад паміраючага гандлю

Ня так даўно мы на старонках нашай газэты прыводзілі даныя аб скарачэньні гандлёвых прадпрыемстваў у **Польшчы.** Гэта скарачэньне з асаблівай сілай адчуваецца ў калёніі Польшчы—**Захоўняй Баларусі.**

Учарайшы віленскі друк падае цікавыя весткі аб замірэньні гандлю ў **Вільні.** «У маі месяцы бягучага году, піша **«Дзеньнік Віленскі»**—з прычыны цяжкіх умоў і запазычанасьці па падатках, ліквідавана 29 гандлёвых і 4 прамысловых прадпрыемствы. У правінцыі за гэты-ж час спынілі сваю дзейнасьць каля 40 прадуктовых крам і некалькі кавярняў і рэстаранаў».

(Уласн. інфармацыя).

Банкруцтва буйнай германскай ашчадкасы

Сёньнішні замежны друк прыносіць весткі аб банкрутстве буйнай германскай ашчадкасы «Консумфэрэйн» у **Магдэбургу.** У выніку гэтага банкруцтва 53 дробных укладчыкаў, пераважна дробнае мяшчанства і рамесьнікі, аказаліся пазбаўленымі сваіх зьберажэньняў. Агульная сума, **якую** ашчадкаса вінна сваім укладчыкам, складае каля трох з паловай мільёнаў марак.

«У часе сходу ўкладчыкаў,—як піша **«Дзеньнік Віленскі»,**—адбыліся бурныя выступленьні супроць кіраўнікоў гэтага прадпрыемства. Выступленьні **ліквідавала паліцыя». (Уласн. інфарм.).**

САКРАТАРОМ РАЙКОМАЎ ПАРТЫІ, СТАРШЫНЯМ РАЙВЫКАНКОМАЎ, ДЫРЭКТАРОМ ЛЕСПРАМГАСАЎ

Месячнік дровазагатовак і лесавывазкі ў вашым раёне зрываецца. Ёсьць пагроза невыкананьня пляну экспорту, зрыву забесьпячэньня Данбасу крапляжом, прамысловасьці і гарадоў будматар'ялам і апалам.

Такое становішча зьяўляецца вынікам фармальных адносін да важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы. Пад вашу асабістую адказнасьць, рашучай барацьбой з кулацкім сабатажам, рэальнымі мерамі ўзьдзеяньня на нявыконваючых узятыя самазабавязацельствы, плян месячніка да 1 ліпеня павінен быць поўнасьцю выкананы у колькасным і асартымэнтным разрэзе.

ЦК КП(б)Б — ІВАНОЎ.
СНК БССР — БЭНЭК.

У СНК БССР

Неадкладна ўзьняць тэмпы сплаўных работ

Пусьціць у сплаў 3.700.000 кубаметраў лесу—такое заданьне БССР на 1933 навігацыйны год. 68 проц. пляну павінна быць выкананa да 1-га ліпеня.

Ад выкананьня гэтага пляну залежыць работа ряду прамысловых прадпрыемстваў, ход будаўніцтва ня толькі ў БССР, але і ў іншых частках Саюзу асабліва на Украіне і ў Данбасе.

Ад нармальнага ходу сплаву залежыць выкананьне экспартных заданьняў і забесьпячэньне апалам БССР.

Гэта сьведчыць аб тым, што Белсплаўкантора (дырэктар тав. Казіміровіч), фэдавыя сплаўныя канторы і сплаўвучасткі не аддаюць выстарчальнай увагі сплаву, не наладзілі апэрацыйнага кіраўніцтва ім. Асабліва марудна праходзіць сплаў па Чачэрскім, Бягомльскім, Вушацкім, Барысаўскім, Пухавіцкім, Прапойскім і Рэчыцкім раёнах.

Ня гледзячы на неаднаразовыя дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК аб забесьпячэньні сплаву патрэбнай рабсілай і аб адказнасьці старшынь РВК, сакратароў райкомаў партыі за пасьпяховае правядзеньне сплаву, рад раённых арганізацый недаацэньвае важнасьці выкананьня сплаўных работ.

Важнейшае пытаньне на сплаве—пытаньне забесьпячэньня рабочай сілай. Між тым у гэтым напрамку становішча асабліва пагражаючае. Вярбоўка рабочай сілы праходзіць нездавальняюча. У першай пяцідзеўцы чэрвеня на сплаве працавала 13.700 чалавек замест патрэбных 22.300 чал. Вярбоўчыкі фармальна адносяцца да сваёй работы. Белсплаўкантора, рэйдавыя сплаўныя канторы, арготы РВК, сельсаветы, праўленьні калгасаў не завербавалі на работу па сплаве выстарчальную колькасьць рабсілы.

Сярод цэлага раду мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў сплаўшчыкаў, важнейшае месца павінна займаць паляпшэньне і наладжваньне работы ОРС'аў. Весткі з месц сьцьвярджаюць аб тым, што ОРС'ы асабліва ў Бягомльскім, Барысаўскім і Вялыніцкім раёнах праяўляюць непаваротлівасьць. У некаторых крамах зусім няма прадуктаў і прамтавараў, у той час, як вызначаныя фонды поўнасьцю забясьпечваюць сплаўныя работы ўсімі неабходнымі прадуктамі і прамтаварамі.

СНК БССР у спэцыяльнай пастанове аб ходзе сплаву прапануе ўзмацнаваму НК Лясной прамысловасьці тав. **Розіну** і кіраўніку Белсплаўканторы тав. **Казіміровічу** неадкладна праверыць працаздольнасьць мізавога апарату сплаўкантор, правільна расставіць сілы і ў найбольш адказочыя сплаўныя вучасткі і пункты накіраваць лепшых адказных работнікаў.

Адначасова СНК абавязаў РВК пад асабістую адказнасьць старшынь неадкладна праверыць становішча сплаву па раёне, зособных рэчках, прыстанях, прыняць рашучыя меры да ўзмацненьня тэмпаў сплаву і поўнага забесьпячэньня рабочай сілай.

Становішча на сплаве абавязвае ўсе раённыя арганізацыі сельсаветы, праўленьні калгасаў па-баявому ўзяцца ва рэалізацыю дырэктыў ЦК і СНК і мабілізаваць неабходныя сілы на ўзьняцьцё тэмпаў сплаву.

Патрэбна балявая прывога ва сплаўных пунктах, неабходны метамкнёныя дзеяньні па ўзьняцьці тэмпаў работы.

Усесаюзныя спаборніцтвы

ТВАР УДЗЕЛЬНІКАЎ

На ўсесаюзнае сьвята на пяжкай атлетыцы зьехаліся 200 фізкультурнікаў з розных рэспублік і абласьцей СССР. Гэта — ня толькі лепшыя ўдарнікі фізкультуры, але і лепшыя ўдарнікі вытворчасьці, якія прымаюць актыўны ўдзел у вытворчым і грамадзкім жыцьці фабрык і заводаў, саўгасаў і калгасаў.

Вось барэц **Вартаньян Сарніз** з Эрывані (Арменія). Ён — лепшы ўдарнік гідрастанцыі Дзор-Агедбуд, кваліфікаваны электраманшдэр. За ўзорную работу на вытворчасьці т. Вартаньян прэміраваны месячным падарожжам па СССР. Камсамолец Вартаньян ня толькі сам здаў нормы на значок «ГПА», але і падрыхтаваў да здачы норм 200 рабочых гідрастанцыі.

Мурат Закіраў — барэц, дэлегат фізкультурнікаў Узбекістану. Ён прымае удзел на ўсесаюзных спаборніцтвах трэці раз. На адборачных спаборніцтвах у Ташкенце ён узяў пярэдняе месца па Узбекістану. Закіраў таксама камсамолец, дынамавец, ударнік...

Сярод прадстаўнікоў Баку — **Альбэрт Шульц.** Гэта лепшы ўдарнік, прэміяваны тэхнік-будаўнік.

Ад БССР у зборную каманду ўвайшло 25 чалавек. Сярод іх фізкультурнік **Лапідус Навум.** Ён былы рабочы шавец. Зараз т. Лапідусу 24 гады. Ня гледзячы на сваю маладосьць, т. Лапідусу выступае на ўсесаюзных спаборніцтвах ужо пасты раз.

Гэта ён сыстэматычна ставіць рэкорды па падыманьні цяжараў.

Баксёр поўлёгкай вагі тав. (Гомель), Андрэй **Пап'ян** (тэхнікум сёр), гіравік **Ананчук** (Іванава-Вазьнясенск) паставіў новы ўсесаюзны рэкорд падняцьця штангі — 85 кгр. замест 84-х.

ШТО ПАКАЗАЛІ ПЕРШЫЯ ДНІ СЬВЯТА

Першыя два дні спаборніцтва паказалі, што фізкультурныя арганізацыі дабіліся значных дасягненьняў па ўсіх відах спорту. Клясна барацьбы значна ўзрасла. Па (думцы галоўсуддзі) па барацьбе тав. **Чэснакова,** такіх цікавых спаборніцтваў, як у сэнсе колькасьці ўдзельнікаў, так і галоўным чынам, у сэнсе высокай клясы спаборнічаючых ня было за апошнія дзесяць год. Нават спартакіяда 1928 года, лучым радзе вагавых катэгорый раўняцца з гэтымі спаборніцтвамі, бліскучыя тэхнікі барацьбы **Лаўроў** (Горкаўскі край), **Пыпіна** (Масква), **Каўтун** (Украіна), **Пустынь** (Паўн. Каўказ), цяжкавагі **Пустынікаў** (Паўн. Каўказ), — зьяўляюцца моўнай зарукай далейшага росту гэта разьвіцьця майстэрства барацьбы.

ХОД СПАБОРНІЦТВАЎ

— 13 чэрвеня праведзены два круглі барацьбы на двух дываноў. Усяго працягнута 71 пара з розных каманд. **Упершыню,** паводле папярэдніх даных, **Ідзе капітулю Масквы, за ім Ленінград, Паўночны Каўказ, Горкаўскі край і г. д.**

З асобных барцоў, як лепшых, трэба адзначыць т. т. **Сэрганскага** (Паўн. Каўказ), **Люлякова, Барзова і Іванова** (Масква), **Лаўрова** (Горкаўскі край). **Нільсона** (Швэцыя), **Пустынькова** (Паўн. Каўказ), **Муравіцкага** (БССР), **Кока** (Карэлія).

— У спаборніцтвах па падыманьні цяжараў 13 чэрвеня прайшлі 54 чалавекі. Прымалі ўдзел каманды Масквы, Ленінграду, БССР, Украіны, Закаўказьвя, Заходняй вобласьці, Горкаўскага краю і ЦЧВ.

Лепшыя дасягненьні **Ў ЦІСКУ ДЗЬВЮМА РУКАМІ** далі наступныя т. т.:

па найлягчэйшай вазе: т. т. Данскі (Украіна), **Лапідус і Кантаровіч** (БССР) 70 кгр.;

па лягчэйшай вазе: т. т. Румаш'ян (Закаўказьве) — 80 кгр.;

па поўлёгкай вазе: т. т. Ананчук (Іванаўская вобл.) — 85 кгр. Тав. Ананчук паставіў новы ўсесаюзны рэкорд супроць апошняга ў 84 кгр.;

па лёгкай вазе: т. т. Старчоў (Іванава), **Шатаў** (Ленінград), **Коркін** (Масква), — 80 кгр.

Па поўсярэдняй вазе, як лепшых, трэба адзначыць **Ганізу** (Масква)—90 кгр. Па сярэдняй вазе —т. **Шульц** (Закаўказьве) — 95 кгр., поўцяжкай вазе — тав. **Крыпоў** (Масква) — 100 кгр. і па цяжкай вазе тав. **Амбарцумаў** (Закаўказьве) — 100 кгр.

ПА РЫЎКУ АДНЭЙ РУКОЙ лепшыя паказальнікі далі:

па найлягчэйшай вазе: тав. **Ла** (БССР) — 55 кгр. Тав. Ліпідус заў новае дасягненьне за ўсесаюзным маштабе;

па поўлёгкай вазе: тав. **Рапапорт** і **Вайнілавіч** (БССР) — кгр. і

па лёгкай вазе: тав. **Шатаў** (Ленінград), які ўстанавіў новае ўсесаюзнае дасягненьне — 75 кгр.



13 чэрвеня тав. АНАНЧУК (Іванава-Вазьнясенск) паставіў новы ўсесаюзны рэкорд падняцьця штангі — 85 кгр. замест 84-х.

* * *

У спаборніцтвах **ПА БОКСУ** і 14 чэрвеня выступіла 67 пар. Лепшыя паказальнікі далі:

у найлягчэйшай вазе т. **Арутюнаў** (Паўночны Каўказ), у лягчэйшай — **Ільлінскі і Ксенафонтаў** (па 2 пункты), у поўлёгкай т. т. **Пап'ян** (Закаўказьве), **Шчупак** (Ленінград) і **Завьялнікаў** (Масква), у лёгкай — **Ігін** (Ленінград), **Андрэеў** (Масква), поўсярэдняй — **Цімафееў** (Ленінград), у сярэдняй — **Лебедзеў** (Ленінград).

15-та чэрвеня адбудзецца суткі бакёраў поўцяжкай і цяжкай вагі.

* * *

— Заўтра на ўсебеларускім стадыёне адбудзецца вялікае фізкультурнае свята, прысьвечанае закрыцьцю ўсесаюзных спаборніцтваў па цяжкай атлетыцы.

— У сьвяце прымуць удзел лепшыя фізкультурныя каманды. Адбудуцца футбольны матч зборнай Масквы і каманды Адэсы. Будзе праведзена тэматычная лёгка-атлетычная эстафета лепшых калектываў Менску.

— Лепшым майстрам СССР па мотацыкльнай гонках прымуць удзел у спаборніцтвах на закрыцьці фізкультурнага сьвята. Сярод удзельнікаў мотагонак прадстаўнікі Масквы, Ленінграду, Харкава, Менску, у тым ліку і вядомыя вялёгонщічкі, як т. т. Іванаў, Казлоў, Станін.

Хроніка

61.560 рублёў вызначана на арганізацыю 135 школьных пляцовак, якія ахопяць 10.925 дзецей. Пляцоўкі разьлічаны на 2 месяцы. У Менску будуць арганізаваны 15 пляцовак і ў Гомелі — 10, у Бабруйску — 8 і ў іншых гарадох па 5 і 3 пляцоўкі.

Тры брыгады пісьменьнікаў накіруюцца ў калгасы на час прапаўнай і ўборачнай кампаній. Усяго ў гэтым годзе ў творчыя камандыроўкі па БССР будзе накіравана 30 пісьменнікаў і па СССР — 10 пісьменнікаў.

Вельмі каштоўныя вынікі **вопыты гадоўлі рыбы ў тарфяных ерах.** Ямы, якія застаюцца пасьля копваньня торфу, запаўняюцца засяляюцца рыбай. На працягу гадоў з аднаго га вады было атрымана 140 кілё таварнай рыбы.

ПАПРАУКА

У пастанове сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб ходзе летняй заліковай сэсіі ў ВТНУ, ВНУ і тэхнікумах («Зьвязда» за 13 чэрвеня г. г. № 128) у § 1, пункце «а» замест слоў: «спробы скажэньня ідэі заліковай сэсіі шляхам адмаўленьня экзамэнаў вышэйшай школы» павінна быць: «спробы скажэньня заліковай сэсіі шляхам адмаўленьня і г. д.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

Чырвоная Зорка Каса—ад 1 г. дня. Замежны мастацкі фільм **БЭЛА ДОННА**

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Мастацкі фільм **„АЭЛІТА"** (АНТАЛ... АЭЛІТ... УТАЛ...)

„ПРАЛЕТАРЫ" Мастацкі замежны фільм **„Чалавек, які сьмяецца"** драма ў 10 частках.

ДЗІЦЯЧЫ кіно-тэатр Каса—з 1 г. дня. Мастацкі фільм **САЛДАЦКІ СЫН** у 6 частках.

„СПАРТАК" Каса—з 3 г. 30 м. МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **КРЫЖ І МАЎЗЭР** драма ў 7 частках.

МЕНСКІ АРХІТЭКТУРНА-БУДАЎНІЧЫ ТЭХНІКУМ (былы Палітэхнікум) —АБВЯШЧАЕ— **НАБОР СТУДЭНТАЎ** на дзённае і вячэрняе аддзяленьні

дзённае аддзяленьне:
а) жылёсному будаўніцтву;
б) жылёваму будаўніцтву;
в) „ вынпленьні і вентыляцыі.

Вячэрняе аддзяленьне:—жылёвае будаўніцтва.

Паступаючыя павінны прадставіць наступныя дакументы:

а) заверaную анкету, б) даведку аб сацыяльным становішчы бацькоў, в) пасьведчаньне аб скончэньні сямігодкі, г) даведку аб нарадженьні, д) даведку аб стане здароўя, е) характарыстыку аб партыйных і грамадзкіх арганізацыях аб удзеле ў грамадзкай працы.

Прыём заяў праводзіцца ў канцылярыі Менскага Архітэктурна-Будаўнічага Тэхнікуму (вуліца Карла Маркса 5) ад 15 чэрвеня г.г. па 1-е жніўня 1933 г.

Аб прыёмных іспытах будзе абвешчана дадаткова праз друк і асабіста на адрасу паступаючага.

УВАГА: на вячэрняе аддзяленьне прымаюцца з адукацыяй на базе шасьцігодкі.

Дырэкцыя тэхнікуму.

Даводзіцца да ведама, што згодна пастановы СНК Бел. ад 10-IV—г. г. і загаду НКЗ БССР ад 6-VI—г. г.,

НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫ КАЛГАСНЫ ІНСТЫТУТ І НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫ САЎГАСНЫ ІНСТЫТУТ **аб'яднаюцца** ў адзіны навукова-дасьледчы Інстытут сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Зацікаўленыя прадпрыемствы, установы і асобы, якія маюць прэтэнзіі да пералічаных інстытутаў, павінны прад'явіць ліквідацыйным камісіям б. Інстытутаў да 28-VI—г. г. па адрасу: Шырокая, 29, навукова-дасьледчы інстытут сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Пасьля паказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.

Ліквід. камісіі.

ПОЛАЦКІ **ЛЕСАТЭХНІКУМ** —абвяшчае— **АСЕНЬНІ ПРЫЁМ** студэнтаў на 1-ы курс лесазагатоўчага і лесагаспадарчага аддзяленьняў у тэхнікуму і 1-ы курс леспрамгасвучу.

Прымаюцца ў тэхнікум асобы, скончыўшыя 7-годку, з іспытамі, а ў леспрамгасвуч—з адукацыяй ня ніжэй 5-ці груп сямігодкі.

Узрост паступаючых у тэхнікум ад 16 да 30 год і ў леспрамгасвуч ад 16 да 20 год.

Прыём заяў працягваецца да 5 жніўня.

Да заяў неабходна дадаць наступныя дакументы: 1) мэтрычную выпіску з прад'яўленьнем на шпарту (пры прыезьдзе на іспыты), 2) аб адукацыі, 3) аб сацыяльным паходжаньні і матэрыяльным становішчы самога і бацькоў, 4) для аднаасобнікаў анкеты ліст за 1932-33 г., 5) даведку аб здароўі, 6) анкету, засьведчаную адпаведнымі органамі, 7) копію вайсковага дакументу, 8) 2 фота-карткі і на 40 кап. паштовых марак.

Іспыты будуць праводзіцца для паступаючых у тэхнікум з 15-га па 20-гажніўня па наступных прадметах: грамадзкаязнаўству, бел. мове, літаратуры, матэматыцы, фізыцы і хіміі ў аб'ёме сямігодкі.

Прыняцьця забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй у залежнасьці ад пасьпяховасьці ад 30-ці руб. і вышэй.

Усе залічаныя ў леспрамгасвуч атрымліваюць зарплату ад 30 руб. і вышэй, згодна каддагавору.

Заняткі ў тэхнікуме і ў леспрамгасвучу пачынаюцца з 1-га верасьня. Тэрмін навучаньня ў тэхнікуме 3 з пал. гады і ў леспрамгасвучу 2 гады.

Дырэктар тэхнікуму **ВЕЛОВІЧ.**

Адзінокаму тэрмінова **ПАТРЭБЕН ПАКОЙ** Паведаміць: Інтэрнацыянальная 13-22 Сользбыт, ст. бухгальтару.

МАРЫНА-ГОРСКІ **САДОВА-ГАРОДНЫ ТЭХНІКУМ,** які рыхтуе аграномаў сярэдняй кваліфікацыі, **праводзіць набор студэнтаў** на гародняе, пладова-ягоднае і тэхнічна-перапрацоўчае аддзяленьні.

Прымаюцца асобы з ведамі ў аб'ёме 7-годкі.

Заявы з адпаведнымі дакумантамі прымаюцца да 10-га жніўня.

Іспыты з 15-га па 25-га жніўня.

Пачатак заняткаў з 1-га верасьня.

Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай.

Адрас: Марына-Горка, садова-гародны тэхнікум.

Дырэкцыя.

БЕЛАРУСКІ **Дзяржаўны Унівэрсытэт** АБВЯЩЧАЕ **АСЕНЬНІ НАБОР СТУДЭНТАЎ** на наступныя факультэты:

Фізмат	110 чал. (55—матэматычнае аддзяленьне і 55—фізычнае аддз.).
Біофак	60 чал
Хэмфак	55 чал.

НА ВЯЧЭРНІ СЭКТАР:

Фізмат	30 чал.
Хэмфак	30 чал.

НА РАБОЧЫ ФАКУЛЬТЭТ:

Дзённае аддзяленьне

На 1, 2 і 3 курсы	250 чал. (з іх на яўр. 1, польск. аддзяленьні па 35 чал.).

Вячэрняе аддзяленьне

На 1, 2, 3 і 4 курсы	400 чал. (з іх на яўр. аддзяленьне 90 чал.).

З восені бягучага году пры БДУ адкрываецца Інстытут асьпірантуры; у гэтым годзе вызначаецца прыём у інстытут асьпірантуры ў колькасьці 13 чал. па спэцыяльных фізыці і матэматыцы.

Заявы прымаюцца да 10-га жніўня на асноўныя факультэты БДУ і ў Інстытут асьпірантуры ў канцылярыі БДУ, а на рабфак—у канцылярыі рабфаку (Менск, Унівэрсытэцкі гарадок, галоўны корпус).

Узрост для паступаючых устаноўлен: на рабфак да 30 год, на ўсе факультэты і ў інстытут асьпірантуры да 35 год.

Іспыты згодна існуючым правіл. для паступленьня ў рабфакі і вышэйшыя навучальныя ўстановы, пачынуцца з 20-га жніўня.

Дакументы ў арыгіналах падаюцца, згодна справачніку НКА БССР аб прыёме ў ВНУ і рабфакі, так і адносна прыёму ў асьпірантуру БАН.

Да дакументаў неабходна прыкласьці 2 заверныя фотакарткі.

Рэктар БДУ **ЕРМАКОЎ.**

НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ харчовай прамысловасьці БССР сумесна з **Цэнтральным Домам Тэхнікі** склікае **16-га** чэрвеня а 7-й гадзіне ўвечары, у **памяшканьні Цэнтральнага Дому Тэхнікі** (Камсамольская 25)

ВЕЧАР СУСТРЭЧЫ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ ІНСТЫТУТУ З РАБОЧЫМІ ІТР ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ гор. МЕНСКУ.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклад дырэкцыі НДІ харчовай прамысловасьці аб праробленай працы і задачах на бліжэйшы пэрыяд.
2. Даклад Наркамснабу БССР аб становішчы і задачах тэхпропу.

Уваход па запрашальных білетах.

НДІ харчовай прамысловасьці ЦДТ.

УСЕБЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ паведамляе ўсе арганізацыі, што **ДА 15-га ЧЭРВЕНЯ г. г.** ПАВІННЫ БЫЦЬ ПРАДСТАЎЛЕНЫ **Касавыя пляны на III-ці квартал 1933 год** у памесячнай разьбіўцы.

Пляны павінны складацца па ўстаноўленай